ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЧЭРВЕНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 107 (27472) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Тэнісістка, тэлевядучая і спявачка Вольга Барабаншчыкава расказала пра адкрыццё новых прафесійных гарызонтаў, пераемнасць любові да музыкі і недапушчальныя правілы гульні.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр:**

***«Падрыхтоўка асноўных аб'ектаў Мінска да чэмпіянату свету па хакеі-2014 павінна завяршыцца да канца гэтага года: да 7 лістапада неабходна здаць у эксплуатацыю шматфункцыянальны спартыўна-забаўляльны комплекс «Чыжоўка-Арэна», а да 1 снежня выканаць добраўпарадкаванне прылеглых да яго тэрыторый. Да канца года трэба будзе ўвесці ў строй яшчэ адзін буйны комплекс — «Аква-Мінск» — з прылеглай да яго інфраструктурай. У тэрміны павінны быць завершаны работы і па ўводзе ў эксплуатацыю дзесяці новых гасцініц, а таксама па падрыхтоўцы студэнцкіх інтэрнатаў да прыёму гасцей чэмпіянату ў сталіцы. Што тычыцца падрыхтоўкі транспартнай інфраструктуры, добраўпарадкавання — усё гэта трэба зрабіць сёлета, да 1 кастрычніка. Маючы адбыцца чэмпіянат свету па хакеі з'яўляецца знакавай падзеяй для Беларусі, і ён павінен быць праведзены на высокім узроўні».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.06.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8720,00 | ▲ |
| Еўра | 11620,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1070,92 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 23° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 24° |
| Гродна | + 23° |
| Магілёў | + 22° |
| Мінск | + 22° |

ISSN 1990 - 763X

ПРАКАВЕТНАЕ

# ГАЮЧАЕ ПОЛЫМЯ «СТРАЛЫ»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сёння ў вёсках беларускага Пасожжа праводзяць абрады «Страла». Яны ўнікальныя і захаваліся, дарэчы, толькі на нашай зямлі. Адно з такіх месцаў — вёска Валосавічы Чачэрскага раёна. Асаблівасць валосавіцкай «Стралы», адрозненне яе ад іншых традыцый у тым, што тут паляць вогнішча, качаюцца вакол і скачуць праз полымя.**

**Наогул, у абрадзе «Страла» выразна прасочваецца сімвалізацыя звароту да розных сіл і з'яў прыроды аб дапамозе ва ўраджаі. Калісь гэта была своеасаблівая спроба ўмяшацца ў прыродныя працэсы, каб адвесці бяду ад паселішчаў і хлебных ніў. «Мы верым, як верылі і нашы дзяды з бабулямі, што «страла» не толькі адводзіць маланкі, град, ураганы і іншыя стыхійныя бедствы ад нашых палеткаў і вёсак, але яшчэ ўмацоўвае здароўе, спрыяе ў хлебаробскіх клопатах, а значыць, паляпшае і наш дабрабыт», — кажуць старэйшыя жыхары вёскі Валосавічы.**

СТАР. 8

■ Соцыум

# «ДАВАЙЦЕ ДАПАМАГАЦЬ ДЗЕЦЯМ... ЗАСТАЦЦА Ў РОДНЫХ СЕМ'ЯХ!»



Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

**Ужо шмат гадоў з задавальненнем гляджу перадачу Цімура Кізякова «Пакуль усе дома». І вельмі ўзрадавалася, калі ў рубрыцы «У вас будзе дзіця» пачалі расказваць не толькі пра расійскіх дзетак, але і пра выхаванцаў беларускіх дзіцячых інтэрнатных устаноў. Паводле слоў намесніка міністра адукацыі Беларусі Віктара ЯКЖЫКА, гэта толькі адна са шматлікіх спроб падарыць сіротам сям'ю.**

**— Віктар Віктаравіч, у суседняй Расіі паспяхова функцыянуе федэральны банк даных аб дзецях-сіротах. Нашы чытачы цікавяцца: ці плануецца нешта падобнае стварыць у Беларусі?**

— Так, мы з Нацыянальным цэнтрам усынаўлення разглядаем праект, звязаны са стварэннем агульнарэспубліканскага інтэрактыўнага партала аб дзецях-сіротах і дзецях, якія засталіся без апекі бацькоў. Там будуць змяшчацца фотаздымкі і іншая інфармацыя пра тых дзетак, якія шукаюць сям'ю. Першыя дакументы ўжо падпісаны. У бліжэйшы час канцэпцыя гэтага партала павінна паступіць у Міністэрства адукацыі.

**— У Францыі распаўсюджана «адкрытае ўсынаўленне» — калі юрыдычна бацькамі з'яўляюцца прыёмныя, але дзіця ведае, што ёсць біялагічная маці, якая па нейкіх прычынах не засталася з ім. Як вы ставіцеся да такой практыкі?**

— У апошнія гады і беларусы перасталі трымацца за тайну ўсынаўлення. Расце павага беларускага грамадства да ўсынавіцеляў, і ўсё менш беларусаў жадаюць мець закрытае ўсынаўленне. Але пакуль ёсць усынавіцелі, якія імкнуцца захаваць тайну свайго прыватнага жыцця, адпаведная норма будзе прысутнічаць у нашым заканадаўстве.

**— Напрыканцы мая прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд падпісаў закон аб легалізацыі аднаполых шлюбаў. Гэтая навіна ўзбударажыла Расію, якая адпраўляе туды сірот на ўсынаўленне. Расійскія дэпутаты публічна выступілі супраць усынаўлення дзяцей нетрадыцыйнымі парамі. І збіраюцца ўнесці адпаведную папраўку ў заканадаўства...**

— Усынаўленне аднаполымі сем'ямі супярэчыць хрысціянскім каштоўнасцям. Гэта не ў традыцыях ні расійскага, ні беларускага народаў. Заканадаўства нашай краіны не дазваляе асобам, якія не знаходзяцца ў зарэгістраваным шлюбе, усынавіць адно і тое ж дзіця. А артыкулам 12 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ўстаноўлена, што шлюб — гэта добраахвотны саюз мужчыны і жанчыны.

**— Сёння ў Беларусі пагадненне аб міжнародным усынаўленні заключана толькі з Італіяй. Ці збіраецеся пашыраць пералік краін, сем'і з якіх усынаўлялі б нашых дзяцей?**

— Пакуль у гэтым няма патрэбы. Яшчэ ў 2004 годзе ў заканадаўстве Беларусі быў устаноўлены прыярытэт нацыянальнага ўсынаўлення. Таму, перш за ўсё, упор робім на свае беларускія сем'і. Вельмі радуе, што з кожным годам становіцца больш рашэнняў суда аб усынаўленні сірот у Беларусі. Так, калі ў першай палове 2000-х гадоў, беларускія сем'і ўсынаўлялі крыху больш як 300 дзяцей, то апошнім часам гэтая лічба трывала трымаецца на ўзроўні ад 520 да 580 дзяцей.

СТАР. 2

■ Падаткі

# ДАХОД — БОЛЬШ ЗА 7,5 МЛН USD

**Найбольшы даход на аднаго чалавека, які быў задэклараваны па выніках мінулага года, складае 66 млрд рублёў, ці 7,58 млн долараў, паведаміла ўчора намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА.**

Такі завоблачны даход летась атрымаў жыхар Беларусі ад продажу пакета акцый. А вось самы вялікі падаходны падатак па выніках дэкларавання 2012 года заплаціў сёлета жыхар Мінска — каля 7 млрд рублёў.

Паводле інфармацыі спадарыні Шаўчэнка, сёлета дэкларацыі аб даходах за мінулы год у падатковыя інспекцыі падалі больш за 25 тысяч чалавек. Сёлета дэкларацыі падавалі тыя асобы, што атрымлівалі даходы ад іншых фізічных асоб, за мяжой ці з-за мяжы, а таксама даходы ад дарэння і продажу маёмасці. У гэтую кампанію дэкларавалі і даходы ад доўгатэрміновай арэнды кватэр, калі сукупны даход па гэтым відзе дзейнасці быў большы за 26,5 млн рублёў. У выніку такога дэкларавання 13 тысяч чалавек былі вымушаны заплаціць дадатковы падатак на суму больш за 113 млрд рублёў. Больш як 11 тысяч работнікаў наведвалі падатковыя інспекцыі для атрымання падатковых ільгот.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Жыллё

# ЯК ЧАСТА ЖЭС ПАВІНЕН ПРАВЯРАЦЬ ТЭХНІЧНЫ СТАН ДАХАЎ?

**Аказваецца, два разы на год, у тым ліку пры падрыхтоўцы да вясенне-летняга перыяду. Пра гэта сказана ў пастанове Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ад 20 мая 2013 года № 12 «Аб вызначэнні пераліку работ па тэхнічным абслугоўванні і перыядычнасці іх выканання», якая ўступіла ў сілу 11 чэрвеня.**

Усяго ў пералік увайшло больш за 150 відаў работ, якія датычацца падтрымання ў спраўным і працаздольным стане падмуркаў, сцен жылых дамоў, перакрыццяў, дахаў, вокнаў і дзвярэй у месцах агульнага карыстання, лесвічных маршаў, балконаў і балконных агароджаў, лоджый, ганкаў, казыркоў над уваходамі ў пад'езды і балконамі верхніх паверхаў і інш. Акрамя таго, да тэхнічнага абслугоўвання адносіцца забеспячэнне спраўнага функцыянавання, наладка і рэгуляванне інжынерных сістэм, а таксама прыборка жылых дамоў і тэрыторыі вакол іх.

Згодна з зацверджаным дакументам, вясной, летам і восенню падмятанне тэрыторый павінна ажыццяўляцца адзін раз на два ці тры дні ў залежнасці ад іх пакрыцця. Таксама ў перыяд з мая па верасень работнікі жыллёва-камунальных службаў абавязаны касіць газон не радзей аднаго разу на месяц.

Што тычыцца перыядычнасці выканання асноўных відаў работ па санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылых дамоў, то, напрыклад, мыццё вокнаў павінна праводзіцца адзін раз на год (вясной), сухая прыборка месцаў агульнага карыстання ад смецця — не менш за два разы на тыдзень, мыццё і дэзінфекцыя лесвічнай клеткі — 2 разы на месяц, прыборка кабін ліфтаў — адзін раз на пяць дзён.

Два разы на год павінна праводзіцца праверка тэхнічнага стану падмуркаў, сцен падвалаў, тэхнічных падпольляў, сцен, унутранага аздаблення (акрамя работ у кватэрах), вонкавага аздаблення, перакрыццяў, падлог, дахаў, вокнаў, дзвярэй, балконаў і лоджый і інш.

Арганізацыі ЖКГ абавязаны правяраць і пры неабходнасці ліквідаваць непаладкі ў працы печаў, сістэм ацяплення, вентыляцыі, унутрыдамавых сістэм гарачага і халоднага водазабеспячэння, водаадвядзення, а таксама сістэм электразабеспячэння.

Адзін раз на месяц неабходна праводзіць праверку працаздольнасці сістэм супрацьдымнай абароны і аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі, не радзей за адзін раз на месяц — здымаць паказанні групавых прыбораў уліку расходу вады, цяпла і электрычнай энергіі.

**Святлана БУСЬКО** ■

# «ДАВАЙЦЕ ДАПАМАГАЦЬ ДЗЕЦЯМ... ЗАСТАЦЦА Ў РОДНЫХ СЕМ'ЯХ!»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Але справа тут нават не ў лічбах: згадзіцеся, якая статыстыка можа адлюстраваць велічыню набытага сіратой сямейнага шчасця?! Дзяржава ж, у сваю чаргу, безумоўна, падтрымлівае і будзе падтрымліваць гэтыя сем'і. Да 16 гадоў на ўсыноўленае дзіця выплачваецца дапамога ў тым жа памеры, што і на дзіця-сірату ў апякунскай сям'і ці ў дзіцячым доме сямейнага тыпу. У праекце Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2011—2015 гады прадугледжаны шэраг мер па ўзмацненні сацыяльна-эканамічнай падтрымкі сем'яў, якія ўсынавілі дзяцей. Сярод стымулаў усынаўлення: павелічэнне памераў аднаразовых і штомесячных дапамог, аптымізацыя падатковай і крэдытнай палітыкі ў дачыненні да ўсынавіцеляў, удасканаленне сістэмы прадастаўлення жылля.

**За мінулы год пазбавіліся роднай сям'і на 23% менш дзяцей, чым за 2010.**

**— Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу да 2015 года зменшыць колькасць дзяцей-сірот, якія знаходзяцца ў інтэрнатных установах. Што робіцца ў гэтым кірунку?**

— Складзены графік скарачэння колькасці інтэрнатных устаноў да 2015 года. Ён выконваецца з апярэджаннем тэрмінаў. Колькасць дзяцей, якія выхоўваюцца ў інтэрнатах, у параўнанні з 2003 годам зменшылася амаль напалову. Думаю, калі і надалей такімі ж крокамі будзе ісці ўладкаванне дзяцей — я маю на ўвазе сямейныя формы выхавання — то да 2020 года ў Беларусі можа і зусім не застацца дзіцячых інтэрнатных устаноў. Але неяк штучна паскараць гэты працэс, без уліку інтарэсаў дзяцей, мы, вядома ж, не будзем. Справа ў тым, што сёння асноўны кантынгент інтэрнатных устаноў — гэта падлеткі. А калі выхаванцу 12 і больш гадоў, то ён не заўсёды згодны ісці ў чужую сям'ю, тым больш на ўсынаўленне. Таму трэба даць гэтым дзецям магчымасць скончыць школу, атрымаць адукацыю. І таксама, лічу, трэба наладзіць постінтэрнатнае суправаджэнне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, сацыяльнымі службамі ў рэгіёнах. 31 мая прынята пастанова ўрада, якой рэгламентаваны міжведамасны падыход да працэсу постінтэрнатнага суправаджэння.

**— А што будзе з работнікамі гэтых інтэрнатаў?**

— Ёсць у сельскай мясцовасці інтэрнаты, якія з'яўляюцца асноўным месцам работы для значнай колькасці жыхароў. Таму мясцовыя органы ўлады павінны ўважліва ставіцца да іх працаўладкавання. Так, Ветрынскую школу-інтэрнат планавалі сёлета закрыць. Але рашэннем райвыканкама працягнулі тэрмін закрыцця, каб паспець працаўладкаваць выхавальнікаў, педагогаў... Большая частка работнікаў інтэрнатаў, калі ўжо ведаюць, што іх установа будзе зачынена, ідуць працаваць прыёмнымі бацькамі ці ў дзіцячы дом сямейнага тыпу. Дарэчы, у беларускіх сем'ях сёння выхоўваецца 18 602 дзіцяці, якія маюць статус дзяцей-сірот, і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў.

**— Часам людзі скардзяцца, што сістэма работы станаўлення прыёмнымі бацькамі занадта забюракратызавана...**

— Я не лічу гэтую сістэму забюракратызаванай. Колькасць дакументаў, якія падаюць кандыдаты ў прыёмныя бацькі, у нас не большая, чым у любой іншай краіне. Гэта ж адказнасць, за дзяцей, за іх выхаванне. Таму нейкі выпадковы чалавек апрыёры не можа працаваць з дзецьмі. Больш за тое, думаю, прыйшоў час удасканаліць у Беларусі падрыхтоўку прыёмных бацькоў. Магчыма, у большай меры рыхтаваць да вырашэння праблем і абароны правоў прыёмных дзяцей. Летась мы ўжо зрабілі першы крок — унеслі пэўныя змяненні ў палажэнні аб прыёмнай сям'і, дзіцячым доме сямейнага тыпу. Кодэксам аб шлюбе і сям'і ўстаноўлена, што прыёмнымі бацькамі, бацькамі-выхавальнікамі могуць быць толькі асобы, якія засвоілі адукацыйныя праграмы спецыяльных курсаў. Трэба стварaць фільтры, якія маглі б даць некую ўпэўненасць, што дзіцяці будзе добра ў новай сям'і.

**— Ці шмат сітуацый, калі прыёмныя бацькі пазбаўляюцца гэтага статусу?**

— Выпадкі, калі прыёмныя бацькі адмаўляюцца ад дзяцей або ў іх забіраюць дзяцей, на шчасце, не вельмі частыя. Напрыклад, летась такіх выпадкаў было 27. Падставы розныя: і перамены ў сямейным стане альбо стане здароўя прыёмных бацькоў, і адсутнасць неабходных умоў для выхавання дзіцяці, і нядобрасумленнае стаўленне да сваіх абавязкаў. Але ў кожным выпадку, самі разумееце, гэта для дзіцяці вялікі стрэс. Таму неабходна больш уважліва падыходзіць да адбору кандыдатаў у прыёмныя бацькі. А для гэтага патрэбны больш ёмістыя спецыяльныя праграмы. І, зразумела, трэба ўдасканальваць практыку суправаджэння сем'яў, якія прынялі на выхаванне дзяцей.

**— У Пермскім краі рэалізуецца інтэрнэт-праект «Віртуальныя бацькі», прысвечаны дзецям-сіротам. Сайт прапаноўвае кожнаму ахвотнаму стаць для дзяцей сябрам па перапісцы, уважлівым настаўнікам-дарадцам... Ваша стаўленне да падобнай ініцыятывы?**

— Цяпер падобнымі і іншымі, значна больш насычанымі валанцёрскімі праектамі, ахоплены навучэнцы Ашмянскай школы-інтэрната, Лідскага дзіцячага дома, дзіцячага дома № 7 Мінска, Чэрвеньскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў, Асіповіцкай спецшколы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату і многіх іншых беларускіх інтэрнатных устаноў. Што тычыцца «віртуальнага бацькоўства», я перакананы, што бацькамі можна быць толькі рэальнымі. Не бывае віртуальных бацькоў. Бацькі — гэта тыя, хто пастаянна побач. Бацькі — гэта пастаянства, такое важнае для кожнага дзіцяці і для кожнага дарослага.

**— Як падтрымаць дзяцей, якія па волі лёсу апынуліся ў доме-інтэрнаце, палепшыць якасць іх жыцця?**

— Не спрачаюся, для дзіцяці-сіраты, асабліва, калі яно мае захворванні і адхіленні ў здароўі, якія абмяжоўваюць яго і без таго вузкае кола зносін, увага — гэта вельмі важны фактар. Але маюць значэнне таксама і форма, і перыядычнасць, і змест кантактаў са староннім дарослым. Няправільна, я лічу, калі кантакт ажыццяўляецца толькі ў спецыфічным... даруйце — спажывецкім фармаце: «Сашу 13 гадоў, ён хворы, сірата і марыць аб веласіпедзе ці тэлефоне». Давайце дадзім яму веласіпед, тэлефон. А далей што? Новая просьба? Выхоўваючы дзяцей у сем'ях, мы прывучаем іх да думкі, што любы падарунак трэба заслужыць, трэба пастарацца. А Сашу шкада, яму проста можна дарыць дабрачынныя падарункі. Ці будзе так заўсёды? Зможа Саша прыняць правілы іншага, дарослага жыцця ці ён заўсёды будзе разлічваць толькі на падарункі і знакі ўвагі старонніх людзей?

**Неабходна больш уважліва падыходзіць да адбору кандыдатаў у прыёмныя бацькі. А для гэтага патрэбны больш ёмістыя спецыяльныя праграмы.**

Звярніце ўвагу, калі дзеці з асаблівым лёсам атрымліваюць валанцёрскі клопат? Толькі тады, калі яны, на жаль, ужо страцілі родную сям'ю. Сёння беларуская сістэма аховы дзяцінства заклікае валанцёраў дапамагаць дзецям... застацца ў родных сем'ях! Родную сям'ю ніхто і нішто не заменіць. Калі ў гэтым пытанні спецыялісты змогуць разлічваць на дапамогу сацыяльна актыўных і неабыякавых людзей, значыць, менш дзяцей будзе мець патрэбу ў валанцёрскім віртуальным ці рэальным клопаце. І староннім людзям менш прыйдзецца набываць дзецям веласіпеды і тэлефонаў. Бо мама з татам змогуць купіць свайму сыну тое, што ён пастараецца заслужыць.

**Надзея ДРЫЛА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ВЫПУСКНЫЯ ПРАЙШЛІ ЯК МАЕ БЫЦЬ!

**З 19 гадзін 11 чэрвеня да 6 гадзін 12 чэрвеня ў Мінску ў 218 навучальных установах прайшлі выпускныя вечары. У гэтых мерапрыемствах, па ацэнках міліцыі, узялі ўдзел больш за 8 тысяч выпускнікоў і каля 10 тысяч бацькоў.**

«У ахове правапарадку была задзейнічана дастатковая колькасць супрацоўнікаў унутраных спраў, намаганні міліцыянераў канцэнтраваліся на забеспячэнні грамадскага парадку, асабістай і грамадскай бяспекі грамадзян, — падвялі вынікі ў ГУУС Мінгарвыканкама. — Задачы па забеспячэнні правапарадку выкананы».

Праўда, на жаль, не абышлося без «лыжкі дзёгцю». Адзінаццацікласнік адной са школ Маскоўскага раёна так і не змог трапіць на выпускны вечар і атрымаць атэстат. Удзень на вуліцы Уманскай яго затрымалі міліцыянеры Маскоўскага РУУС за захаванне курыцельнай сумесі, якая змяшчала ў сваім саставе псіхатропныя рэчывы. 17-гадовага раней судзімага мінчаніна затрымалі ў зале ігральных аўтаматаў. У яго знайшлі 0,4 г курыцельнай сумесі. Юнак прызнаўся, што хацеў спажыць спайс перад выпускным вечарам. Па заканчэнні праверкі матэрыялы будуць перададзены ў раённы аддзел Следчага камітэта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АВІЯРЭЙС ПА АДЗІНЫМ КВІТКУ

**Пасажыры «Белавія» атрымалі магчымасць карыстацца найбольш зручнымі стыкоўкамі з рэйсамі расійскага перавозчыка «Ютэйр» у «Дамадзедава», Екацярынбургу, Самары і Новасібірску, што зробіць падарожжы больш камфортнымі і дазволіць сэканоміць час, які давядзецца затраціць на дарогу.**

— Дзякуючы такому супрацоўніцтву пасажыр можа аформіць адзіны квіток на ўсім маршруце як на рэйсы «Белавія», так і на рэйсы «Ютэйр», — адзначыў генеральны дырэктар Нацыянальнай авіякампаніі «Белавія» Анатоль Гусараў.

Па інфармацыі прэс-службы «Белавія», з 2011 года паміж беларускай авіякампаніяй і авіякампаніяй «Ютэйр» дзейнічае інтэрлайн-пагадненне, якое прадастаўляе права афармляць авіяперавозку на сваіх бланках на маршруты авіякампаніі-партнёра. 11 чэрвеня 2013 года пачаўся ўзаемны продаж электронных авіяквіткоў, што дазволіць пасажырам набываць іх праз інтэрнэт па ўсім маршруце.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## БРАКАНЬЕРА-РЭЦЫДЫВІСТА ЗАТРЫМАЛІ Ў ЗАКАЗНІКУ

**Добрае надвор'е і выхадныя прываблiваюць да вады не толькі аматараў пікнікоў і загару. Таму менавіта гэты час становіцца самым гарачым для работнікаў інспекцый аховы жывёльнага і раслiннага свету.**

Азёры Глыбоччыны — адны з найпрыгажэйшых, а таму і прываблівых. Самае глыбокае ў Беларусі — Доўгае — з'яўляецца гідралагічным заказнікам рэспубліканскага значэння. Натуральна, інтэнсіўныя спосабы рыбалкі на ім забаронены. Аднак гэтая акалічнасць не стрымала паляўнічага азарту мінчаніна, які прамышляў тут падводным паляваннем. Як паведаміў начальнік Глыбоцкай міжрайінспекцыі Аляксей Протас, падчас затрымання парушальнік усяляк спрабаваў «замесці» сляды правiны: спрабаваў уцячы, утапіў стрэльбу і здабытых шчупакоў... Аднак адкруціцца не атрымалася — інспектары канфіскавалі незаконна здабытую рыбу і стрэльбу для падводнага палявання. Матэрыялы ў дачыненні да парушальніка накіраваны ў суд. Браканьеру пагражае істотны штраф з канфіскацыяй прылад рыбалоўства. Цікава, што злоўлены парушальнік аказаўся «добрым знаёмым» ахоўнікаў прыроды: у 2008 годзе яго ўжо затрымлівалі, прычым на гэтым жа возеры. Мінулая адміністрацыйная адказнасць не стала навукай «паляўнічаму-рыбалову».

Акрамя таго, у гэты ж дзень інспектары затрымалі яшчэ аднаго аматара незаконнага промыслу, які рыбачыў з дапамогай лесачных сетак на возеры Чачэлі, што побач з райцэнтрам. А 10 чэрвеня, у панядзелак, разбіраўся з браканьерамі давялося на штучнай сажалцы ў вёсцы Мацюкова. Ацэнку незаконным дзеянням «рыбаловаў» дасць раённы суд.

**Ул. інф.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»**
доводит до сведения дольщиков и заинтересованных лиц
**О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНЫЕ ДЕКЛАРАЦИИ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**
**объекта «Многоэтажный жилой дом не повышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная Горка-3» (жилой дом)** в г. Минске,
*опубликованные в газете «Звязда» 10 и 28 мая 2013 года:*
**Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – 10 января 2015 г.**
Генеральный директор Н.В. Милошевский
УНП 100071325

# КДК СУПРАЦЬ ПАВЫШЭННЯ ТАРЫФАЎ АЎТАСТРАХАВАННЯ

**Пытанні страхавання і раней абмяркоўваліся ў Камітэце дзяржаўнага кантролю. Па яго прапанове ад пасад вызваляліся кіраўнікі страхавых арганізацый, змянілася кіраўніцтва страхавога нагляду Міністэрства фінансаў. Аднак, як паказалі нядаўнія праверкі, у гэтай сферы пакуль па-ранейшаму мноства парушэнняў і недахопаў... Больш за ўсё пытанняў да самых буйных айчынных страхоўшчыкаў — «Белдзяржстраха» і «Белэксімгаранта».**

Тое, што «Белдзяржстрах» і «Белэксімгарант» здаюць свае пазіцыі, выклікае занепакоенасць у **старшыні КДК Аляксандра ЯКАБСОНА.** Паводле яго слоў, удзельная вага «Белдзяржстраха» на страхавым рынку рэспублікі за апошнія 2 гады скарацілася з 52% да 49%. «І гэта пры тым, што заканадаўствам гэтай арганізацыі дадзены выключныя правы на правядзенне практычна ўсіх відаў абавязковага страхавання. А з бюджэту ў яе ўстаўны фонд былі ўнесены значныя грашовыя сродкі».

Практычна не выконвае сваю асноўную функцыю па забеспячэнні страхавой абароны нацыянальных экспарцёраў «Белэксімгарант». Летась гэтая кампанія застрахавала ўсяго 1% ад кошту тавараў, што экспартуюцца. Больш за тое, узносы арганізацый-экспарцёраў складаюць толькі 18%. Усю астатнюю суму кампанія, створаная для экспартнага страхавання, дабірае іншымі відамі страхавання.

Абуральным з'яўляецца і тое, што страхоўшчыкі, як правіла, бачаць рашэнне сваіх праблем за кошт страхавальніка. Так, страхавыя арганізацыі ўжо некалькі гадоў просяць павысіць тарыфы па абавязковым страхаванні грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. І гэта пры тым, што ў распараджэнні страхоўшчыкаў штогод застаецца каля 40% узносаў па гэтым відзе страхавання.

**Страхоўшчыкі, якія плачуць з-за недахопу сродкаў для выплаты страхоўкі за аварыйнае аўто, агентам плацяць у два разы больш, чым устаноўлена Мінфінам.**

— Мы не можам падтрымаць прапанову аб павышэнні страхавых тарыфаў — і тым самым дазволіць страхоўшчыкам вырашыць свае фінансавыя цяжкасці за кошт страхавальнікаў, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за банкаўскай і знешнеэканамічнай дзейнасцю КДК Валянцін ПАТАПОВІЧ.** — Справа ў тым, што аўтамабіль сёння не з'яўляецца раскошай: ён, у першую чаргу, сродак перасоўвання. Таму гэта сацыяльнае пытанне. Тым больш у страхавых арганізацый дастаткова ўнутраных рэзерваў для правядзення такога віду абавязкова страхавання.

Сапраўды, цікава, што страхоўшчыкі, якія плачуць з-за недахопу сродкаў для выплаты страхоўкі за аварыйнае аўто, агентам за афармленне абавязковага страхавання плацяць у два разы больш, чым устаноўлена Мінфінам.

— Толькі ў 2012 годзе страхоўшчыкі выплацілі страхавым пасярэднікам — агентам і брокерам — за іх паслугі больш за 100 млрд рублёў, — паведаміў Аляксандр Якабсон. — А гэта ў 4,5 раза больш, чым 2 гады таму. Даходзіць да таго, што палова сум страхавых узносаў застаецца ў пасярэднікаў. Таму відавочна, што заканадаўства, якое рэгулюе іх дзейнасць, патрабуе змен.

Ёсць таксама праблемы, звязаныя з добраахвотным страхаваннем адказнасці за невыкананне абавязацельстваў эмітэнта аблігацый.

— У пагоні за лёгкімі грашыма страхоўшчыкі заключаюць дагаворы з фірмамі, у якіх ні кала, ні двара, ні работнікаў, — працягвае старшыня КДК. — Гэтыя фірмы выпускаюць на мільярдныя сумы аблігацыі, прадаюць іх і знікаюць разам з грашыма. Пры гэтым выконваць абавязацельствы па аблігацыях даводзіцца страхоўшчыкам. Так, з-за невыканання прынятых эмітэнтамі абавязацельстваў «Белдзяржстрах» выплаціў страхавую кампенсацыю трымальнікам аблігацый у памеры 12 млрд рублёў, яшчэ 80 млрд рублёў можа быць выплачана ў бліжэйшы час па прад'яўленых патрабаваннях.

...І гэта далёка не ўсе рэзервы, якія маюцца ў страхавых кампаній. Дастаткова іх выкарыстаць — і не трэба будзе ў 2 разы падымаць тарыфы!

Шмат наракання ў грамадзян і на якасць страхавых паслуг. Нярэдка работнікі страхавых арганізацый дапускаюць грубыя памылкі пры выплаце страхавой кампенсацыі грамадзянам. У выніку людзі недаатрымліваюць значныя сумы.

— Многіх недахопаў і парушэнняў можна было б пазбегнуць, калі б Міністэрства фінансаў аператыўна рэагавала на негатыўныя працэсы на страхавым рынку і своечасова прымала неабходныя рашэнні ці ўносіла прапановы па ўдасканаленні заканадаўства, — рэзюмаваў Аляксандр Якабсон. — Але часта наша міністэрства працуе, як статыст...

**Надзея ДРЫЛА.**

# АД «ЗАЛАТОЙ РЫБКІ» ДА ЗАЛАТЫХ МЕДАЛЁЎ

**Чэмпіёнкі трымаюць сваё слова! Яшчэ на зыходзе мінулага года двухразовая алімпійская прызёрка плыўчыха Аляксандра Герасіменя паабяцала арганізаваць і правесці аматарскі дзіцячы турнір па плаванні. Сказана — зроблена. Турнір «Залатая рыбка» стартаваў у красавіку ва ўсіх раённых цэнтрах, а ўжо ў маі адбыліся фіналы ў абласных сталіцах. Спаборніцтвы аб'ядналі амаль што 11 тысяч дзяцей з 954 школ па ўсёй краіне.**

Па словах **намесніка прэм'ер-міністра краіны і старшыні федэрацыі плавання Анатоля ТОЗІКА**, гэта ўнікальны праект, які не мае аналагаў на тэрыторыі СНД: «У першую чаргу перад арганізатарамі турніру стаіць мэта замацаваць у дзяцей плавальныя навыкі. Увіцце, зараз у навучальнай праграме 240 гадзін вылучана для заняткаў у басейне, але палова школьнікаў плаваць не ўмее. У XXI стагоддзі такога быць не павінна!». Таксама А. Тозік адзначыў, што ў наступным годзе турнір выйдзе на рэспубліканскі ўзровень, будуць задзейнічаны ўсе басейны, незалежна ад таго, падпарадкоўваюцца яны сістэме адукацыі ці не. «Дзякуючы гэтым спаборніцтвам належным чынам будзе развівацца інфраструктура, — дадаў старшыня федэрацыі. — Са 118 раённых цэнтраў у 50 да гэтага часу няма басейнаў. Гэту сітуацыю трэба выпраўляць. Зусім нядаўна было прынята рашэнне не пачынаць будаўніцтва новай школы без распрацоўкі ў ёй праекта басейна».

Ініцыятар і ідэйны натхняльнік турніру Аляксандра Герасіменя адной з галоўных задач спаборніцтваў называе пошук рэзерву для прафесійнага спорту: «Такім чынам мы зможам заўважыць дзяцей, здольных паказваць высокія вынікі і не згубіць іх з вачэй. Школьнікі, якія займаюцца плаваннем, вельмі часта пакідаюць прафесійны спорт, рыхтуючыся паступаць у ВНУ. Мы хочам, каб дзецям не прыйшлося выбіраць — спорт ці прафесія. І федэрацыя займаецца вырашэннем гэтай праблемы».

Віцэ-прэм'ер урада пацвердзіў, што ўжо зараз у школах актыўна арганізоўваюцца спартыўныя класы, у якіх дзеці будуць спалучаць трэніроўкі са звычайнай вучобай. Акрамя гэтага ён нагадаў, што яшчэ летась была створана Асацыяцыя студэнцкага спорту, дзейнасць якой павінна дапамагчы ўчарашнім школьнікам застацца ў прафесійным спорце. «Так, кожны ўніверсітэт будзе развіваць канкрэтны від спорту. Напрыклад, у БНТУ гэта гандбол, цяжкая атлетыка і плаванне, у БГУ — лёгкая атлетыка і плаванне і г.д., — патлумачыў А. Тозік. — І тут задача перад самімі ВНУ — знаходзіць абітурыентаў з пэўным наборам ведаў і спартыўнымі навыкамі. Гэтая сістэма ў нас толькі распрацоўваецца, але спадзяюся, што ўжо праз 2—3 гады яна запрацуе на поўную моц».

Акрамя таго, старшыня федэрацыі расказаў, што наша краіна падала заяўку на правядзенне ў Брэсце юніёрскага чэмпіянату Еўропы-2016. Раптам сярод яго ўдзельнікаў будзе нехта з тых дзяцей, якія гэтай вясной выступілі на сваіх першых спаборніцтвах?

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

■ Напярэдадні

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАРАДА: ГЕНЕРАЛЬНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ

**Да галоўнага свята краіны — Дня Незалежнасці — застаюцца лічаныя дні. Падрыхтоўка да ваеннага параду ў самым разгары. Стравы пляц Ваеннай камендатуры, што ў ваенным гарадку ва Уруччы, ператварыўся ў рэпетыцыйную пляцоўку.**

З ліпеня перад мінчанамі і гасцямі сталіцы ў парадных разліках пройдзе каля 3-х тысяч вайскоўцаў. Сярод іх — выхаванцы Мінскага суворацкага ваеннага вучылішча, курсанты Ваеннай акадэміі і ваенна-тэхнічнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, ваеннаслужачыя 120-й гвардзейскай механізаванай брыгады, 38-й гвардзейскай мабільнай брыгады і 5-й брыгады спецыяльнага прызначэння, а таксама прадстаўнікі іншых злучэнняў і вайсковых часцей, рота ганаровай варты, зводны аркестр Узброеных Сіл. Акрамя таго ў святочным шэсці прымуць удзел парадныя разлікі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, унутраных войскаў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

— Сёння мы рыхтуемся да генеральных рэпетыцый, якія пройдуць 26 і 29 чэрвеня непасрэдна на тым месцы, дзе адбудзецца парад, — зазначыў **першы намеснік начальніка Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Іван ГАРДЗЕЙЧЫК.** — На гарнізонным пляцы вайскоўцы трэніруюцца два разы на тыдзень па 2-2,5 гадзіны. Яшчэ штодзень кожнае вайсковае падраздзяленне па 2-3 гадзіны займаецца і на сваёй тэрыторыі.

Першымі адкрыюць парад самыя юныя яго ўдзельнікі — выхаванцы Мінскага суворацкага вучылішча. Суворацы ў прыгожай чорнай форме з чырвонымі пагонамі і белымі папругамі будуць не толькі сінхронна ісці, трымаючы раўненне, а і адначасова біць у барабаны. Гэта ўжо традыцыя.

У парадзе прыме ўдзел 19 пешых калон. Кожная «каробка» будзе адметная сваёй формай адзення.

— Калона курсантаў галоўнай ваеннай ВНУ краіны будзе апранута ў франтавую форму, — расказвае **курсант 1-га курса агульнавайсковага факультэта Ян РУЦКІ.** — Гэта своеасаблівая даніна памяці франтавікам. Невыпадкова гэта роля адведзена нам, будучым пехацінцам і танкістам: якраз такая форма была падчас вайны ў прадстаўнікоў гэтых ваенных прафесій. Мы дакладна адчуваем, як нялёгка было салдатам Перамогі ваяваць у гэтым адзенні. Боты сваім цяжарам цягнуць да зямлі, аўтамат вагой у 5 кілаграмаў таксама не для слабакоў.


Фота БЕЛТА.

Асобнай часткай парада стане выступленне зводнай роты ганаровай варты. Ёй падрыхтавана новая праграма, дзе будзе задзейнічана каля 70 ваеннаслужачых.

— Летась праграма пляц-канцэрта была разлічана прыкладна на 8-9 хвілін, — расказаў **камандзір роты ганаровай варты старшы лейтэнант Павел ШПАРЛА.** — Цяпер у аснову ўзяты новыя прыёмы, якія значна адрозніваюцца ад тых, што раней можна было ўбачыць падчас парада. Гэта больш за 10 новых прыёмаў, невядомых гледачам. Таксама, у параўнанні з мінулымі гадамі, ускладнена праграма віртуозаў, якія працуюць з карабінамі. Перакананы, што гледачы будуць у захапленні!

Дарэчы, прадстаўнікі роты ганаровай варты да пляц-канцэрта пачалі рыхтавацца яшчэ ў лютым. Спачатку прыёмы адпрацоўваліся з кожным вайскоўцам, у красавіку пачаліся сумесныя трэніроўкі. Агульны сцэнарый выступлення элітнага падраздзялення Узброеных Сіл краіны складзены з дапамогай вынаходлівых ідэй саміх удзельнікаў парада.

— Удзельнічаць у парадзе для мяне — вялікі гонар, — прызнаецца **салдат тэрміновай службы 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння сяржант Ягор ДУБАВЕЦ.** — Раней глядзеў парад па тэлебачанні, а зараз сам буду ў эпіцэнтры падзей. Адчуваю вялікую адказнасць, нават хваляванне.

Урачыстае шэсце войскаў Мінскага гарнізона пройдзе пад музычнае суправаджэнне зводнага аркестра Узброеных Сіл краіны. Каля 230 ваенных музыкаў выканаюць папулярныя ваенныя кампазіцыі. Пачуць іх — значыць атрымаць вялікую асалоду, а ўбачыць парад — удвая.

**Вераніка КАНЮТА** ■

■ Футбол

# ПАДКОПЫ ФАРТУНЫ ЦІ ПРАБЛЕМЫ КАМАНДЫ?

**Зборная Беларусі па футболе не змагла атрымаць перамогу над фінамі і з другой спробы. У кваліфікацыйным матчы чэмпіянату свету-2014 падапечныя Георгія Кандрацьева згулялі ўнічыю са скандынавамі.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Не дапамагла камандзе і выдатная атмасфера, якая панавала на гомельскім стадыёне «Цэнтральны». Беларускія заўзятары арганізавалі неверагодную падтрымку, напэўна, адчуваючы, наколькі патрэбна зборнай перамога. Але ўжо ў сярэдзіне першага тайма з'явілася прычына засмучацца: госці паразілі вароты Сяргея Верамко. Лік 1:0 на карысць фінаў захоўваўся амаль да самага канца матча. Як і ў папярэдняй сустрэчы, беларускія футбалісты шмат білі... але не забівалі. І толькі на 85-й хвіліне Дзмітрый Верхаўцоў ударам галавой адправіў мяч у вароты саперніка. Трэба аддаць належнае падапечным Георгія Кандрацьева — хлопцы да апошняй секунды матча спадзяваліся вырваць перамогу. «Калі Верхаўцоў зраўняў лік, з'явілася адчуванне, што «дацісне» фінаў. У Стаса Драгуна яшчэ быў добры момант», — прызнаваўся Рэнан Брэсан.

Такім чынам, беларуская каманда па-ранейшаму застаецца на апошнім месцы ў сваёй кваліфікацыйнай групе. Наступныя адборачныя матчы — толькі ў верасні. Ёсць час ачуняць, разабрацца ў праблемах зборнай... Адказы на пытанні дакладна спатрэбяцца ў сустрэчах з грознымі французамі і непераможнымі іспанцамі.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ** ■

АХОВА
ПАД ЗНАКАМ САВЫ № 3 (36)
СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

*Працягваецца конкурс на лепшую публікацыю аб дзейнасці Дэпартамента аховы ў намінацыях «Лепшая публікацыя ў друкаваных СМІ», «Лепшая публікацыя ў інтэрнэт-СМІ» і «Лепшая фотапраца». Матэрыялы прымаюцца да 1 кастрычніка на электронны адрас ohrana_konkurs@mail.ru. Пераможцаў чакаюць тры першыя, тры другія і тры трэція прэміі.*

*Дадатковая інфармацыя размешчана на афіцыйных сайтах Дэпартамента аховы (www.ohrana.gov.by) і газеты «Звязда».*

# ЯНЫ ТАКСАМА СЛУЖАЦЬ...

**Лічыцца, што яны таксама служаць у міліцыі. Здольныя прайсці не адзін кіламетр па следзе злачынца і затрымаць яго. Могуць знайсці наркотыкі або зброю ў самай надзейнай схованцы. І, нарэшце, яны — самыя верныя і адданыя сябры. Гэта — службова-вышуковыя сабакі.**



Гадоўляй і выхаваннем будучых чатырохногіх памочнікаў у сталічнай вобласці займаецца гадавальнік службовых сабак Мінскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы. Цяпер у падраздзяленнях упраўлення служаць 139 сабак. Толькі сёлета з іх дапамогай раскрыта 46 злачынстваў.

Пра асаблівасці і некаторыя сакрэты падрыхтоўкі чатырохногіх вартавых парадку распавёў старшы інспектар-кінолаг гадавальніка лейтэнант міліцыі Ігар Клімковіч.

***— Ігар Анатольевіч, якія пароды сабак больш прыдатныя для службы?***

— У асноўным гэта нямецкія аўчаркі — самыя разумныя, якія ідэальна падыходзяць для службы ў ахове. Таксама ў нас ёсць бельгійскія аўчаркі і ратвейлеры. Аднак паўтаруся, што сабакі лепш за нямецкую аўчарку нам не адшукаць.

***— Службовыя абавязкі чатырохногіх памочнікаў вельмі складаныя?***

— Нашы сабакі служаць у групах затрымання, ахоўваюць аб'екты. Кінолагі са сваімі гадаванцамі ўваходзяць у склад следча-аператыўнай групы райаддзела, якая выязджае на месца здарэння. Сабакі працуюць па пахавым следзе, па выбарцы рэчы — калі ў падазронага бяруць якую-небудзь рэч і сабака апазнае яе сярод іншых, а таксама па выбарцы чалавека — па паху рэчы сабака сярод некалькіх чалавек вызначае гаспадара. У нашай службе чатырохногія памочнікі і затрымліваюць злачынцаў, і выязджаюць на затрыманне для псіхалагічнага ўздзеяння. На практыцы гэты спосаб вельмі дзейсны: зламыснік разумее, што схавацца або ўцячы яму не ўдасца.

***— З якога ўзросту шчаня лепш трэніраваць і як хутка яно можа стаць паўнавартасным напарнікам кінолага? Як пачынаецца вучэбны працэс?***

— Дзесьці з паўтара месяца шчанят пачынаюць вывадзіць на вуліцу, прывучаць да шуму аўтамашын, вялікай колькасці людзей. Спачатку дастаткова 15 хвілін, затым час прагулкі паступова павялічваецца. Першапачаткова сабаку прывіваюцца агульныя навыкі: ён павінен адклікацца на сваю мянушку, ведаць свайго гаспадара, прызвычаіцца да нашыйніка, ланцужка, цікавіцца апартуемым прадметам і ўмець знаходзіць яго, адэкватна ўспрымаць моцныя светлавыя і гукавыя раздражняльнікі. Калі сабаку споўніцца 8 месяцаў, ён ужо гатовы працаваць паўнацэнна.

***— Па якіх параметрах вызначаецца прыдатнасць сабакі да службы ў складзе групы затрымання?***

— Першапачаткова шэраг паводніцкіх рэакцый у шчанят прыроджаны, ён дастаўся з генамі ад бацькоў. Мы глядзім, каб шчаня магло спакойна ўспрымаць стрэлы, шум, чужых людзей. Яно не павінна палохацца чагосьці новага. Напрыклад, кінуўшы звязак ключоў у вальер са шчанятамі, мы назіраем, хто з іх спалохаўся і ўцёк, а хто з цікаўнасцю вывучае невядомы прадмет. У шчаняці павінна быць добра развітая апартыровачная і абарончая рэакцыі, але, у той жа час, да чужых людзей сабака павінен быць настроены добразычліва.

***— Як доўга служыць сабака?***

— У сярэднім — гэта восем гадоў. Ёсць сабакі, якія могуць праслужыць і дзесяць гадоў, а ёсць і такія, хто ўжо ў шэсць-сем гадоў не ў стане працягваць працу, і яго трэба мяняць.

***— Які рацыён харчавання сабакі? Ці дорага абыходзіцца яго ўтрыманне?***

— Сабак кормяць два разы на дзень. У іх катловае харчаванне. У рацыён уваходзяць ячныя крупы, гароднiна, ялавічны тлушч, мяса і субпрадукты 2-й катэгорыі. На харчаванне ў дзень выдзяляецца крыху больш як 11 тысяч рублёў. Ёсць яшчэ выдаткі на медыкаменты, амуніцыю. Кожнаму сабаку патрэбны вітаміны, прышчэпкі і абавязковая вакцынацыя ад інфекцый.

***— Ігар Анатольевіч, а як у вас выбіраюць мянушкі для гадаванцаў?***

— Выбар мянушкі — цікавы, а часам і вельмі складаны працэс. Калі нараджаецца памалоўе, усе мянушкі павінны пачынацца на адну літару. Ідзём строга па алфавіце: калі мінулае паглоўе звалі на літару К, то наступнае абавязкова на літару Л. Калі падае літара Э, то выбар мянушак становіцца праблемай. Часам ламаем галаву тыдні два, а то і больш, бо для дрэсіроўкі мянушка павінна быць кароткай, гучнай і не паўтарацца. За гадзіну трэніроўкі мянушку прыходзіцца называць разоў 150, і, калі яна доўгая, гэта будзе нязручна і кінолагу, і сабаку.

***— Як і ў міліцыянераў, служба ў чатырохногіх памочнікаў і небяспечная, і цяжкая. Якія найбольш цікавыя прыклады раскрыцця злачынстваў з дапамогай вашых гадаванцаў?***

— Зусім нядаўна наш кінолаг са сваім падапечным змог раскрыць забойства. Грамадзянін пасля сумеснага распіцця спіртных напояў нанёс сабутэльніку некалькі смяротных нажавых раненняў. Сабака быў пастаўлены на след і ў гэты ж дзень знайшоў злачынцу.

Вясной у Чэрвені трое мінчан учынілі разбойны напад на мясцовую краму. Зачыніўшы прадаўшчыцу, выкралі яе мабільны тэлефон і ўсю выручку. У складзе групы затрымання быў службова-вышуковы сабака, які за лічаныя хвіліны па пахавым следзе затрымаў усіх налётчыкаў.

**Гутарыла Наталля СВІДУНОВІЧ.**

## ■ Будні «Аховы»

### «ПНЕЎМАТЫЧНЫЯ» АГРЭСАРЫ

**Каля 10 гадзін вечара на пульт цэнтралізаванага назірання аддзела аховы Заводскага раёна сталіцы паступіў выклік: націснулі экстранную кнопку сігналізацыі ў адной з крам. За лічаныя хвіліны старшы прапаршчык міліцыі Валерый Абрамаў і сяржант міліцыі Юрый Шутаў дабраліся да месца здарэння ў Шабанах. Прадавец расказала, што двое невядомых, пагражаючы прадметам, вельмі падобным на пісталет, патрабавалі спіртныя напоі.**

Гора-налетчыкаў не давялося доўга шукаць. Яны, не спяшаючыся, аддаляліся ад крамы. А пасля затрымання свой учынак палічылі звычайнай справай. Пілі ўвесь дзень, вечарам выбраліся па дабаўку. На жаданы каньяк грошай не хапіла. Каб забраць яго, вось і выцягнулі з кішэні пнеўматычны пісталет. Што тут, маўляў, дрэннага? Не вяртацца ж па грошы і хадзіць у магазін двойчы? Пнеўматычная зброя ў руках п'янчуг стала сустракацца даволі часта. Толькі за мінулы месяц экіпажы аховы ўжо неадноййчы затрымлівалі такіх зламыснікаў. У Гомелі налётчыкі ў марлевых масках спрабавалі абрабаваць краму. У Бабруйску мужчына, пагражаючы пнеўматычным пісталетам, патрабаваў наліць яму піва. У тым жа горадзе п'яны страляў з пнеўматыкі па гарадскім аўтобусе. А яшчэ пра адзін выпадак чытайце ніжэй.

### ПІСТАЛЕТ — ЯК АРГУМЕНТ ФІНАНСАВАЙ СПРЭЧКІ

**30-гадовы маляр адной з гродзенскіх будаўнічых фірмаў, будучы нецвярозым, накінуўся на свайго былога працадаўцу з пнеўматычным пісталетам.**

Сваё незадавальненне работнік не раз выказваў і раней, аднак дырэктару ўдавалася парыраваць усе прэтэнзіі аргументаванымі довадамі. А самы апошні канфлікт узнік ужо на глебе фінансаў. Хлопец запатрабаваў выплаціць яму частку абяцанай выхадной дапамогі. Аднак, атрымаўшы адмову, дастаў пнеўматычны пісталет і прыставіў зброю да скроні жанчыны. Дырэктар з цяжкасцю змагла набраць «102» і папрасіла дапамогі. Для затрымання зламысніка накіраваўся экіпаж Ленінскага аддзела аховы. Праваахоўнікі па дарозе атрымалі прыкметы падазронага, які ўжо кінуўся наўцёк. Вызначылі прыкладны кірунак яго руху. І на скрыжаванні вуліц Багуцкага і Урублеўскага мужчына з пісталетам быў затрыманы. У дачыненні да яго цяпер заведзена крымінальная справа па 186-м артыкуле — пагроза забойствам.

**Алена ЯРМАЛІНСКАЯ** ■

# ЮБІЛЯР СУВЯЗІ НЕ АБРЫВАЕ

**Нядаўна ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны і ветэран нашай службы Мікалай Барысавіч Крумкачоў адзначыў юбілей — сваё 90-годдзе.**



За гэтыя гады на яго долю выпала нямала выпрабаванняў. Але, як кажуць, Бог ніколі не пасылае чалавеку цяжкасцяў больш, чым ён можа вынесці...

Калі пачалася вайна, Мікалаю Барысавічу споўнілася васямнаццаць. Яго сям'я пражывала ў вёсцы Хмелена Рагачоўскага раёна. Бацьку і брата гітлераўцы расстралялі. А хлопец стаў сувязным партызанскага атрада. Падключалі яго і да баявых аперацый. Самая першая — падрыў чыгуначнага палатна. І ён з задачай справіўся.

З 1943 па 1944 гады ў складзе 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады Мікалай Крумкачоў ваяваў на Гомельшчыне, Магілёўшчыне і Міншчыне. Да вызвалення сталіцы Мікалай Барысавіч дайшоў ужо ў складзе 728-й танкавай брыгады. І колькасці яго ўзнагарод за партызанскую дзейнасць мог бы пазайздросціць любы франтавік. З самых дарагіх — ордэн Айчыннай вайны, медалі «За баявыя заслугі» і «За адвагу».

Пасля вайны Мікалай Барысавіч пачаў міліцэйскую кар'еру. Спачатку — рэгуліроўшчыкам, потым працаваў у пашпартным аддзеле МУС. Пасля пераведзены ў аб'яднанне «Ахова» на пасаду старшага інспектара службы. Пайшоў у адстаўку адтуль ужо ў званні падпалкоўніка міліцыі.

Зайздросны юбілей адзначыў Мікалай Барысавіч. Прыемна, што і ў гэтыя гады ён не страціў бадзёрасці і сілы духу. І з ранейшай службай сувязяў не абрывае. Яго веды, вопыт і нават звычайныя словы падтрымкі вельмі патрэбны сённяшняму пакаленню.

**Алена ЯРМАЛІНСКАЯ.**

# ЗЛОДЗЕЙ ЗНОЙДЗЕНЫ ІМГНЕННА

**Дзённая змена Івана Барадуленкі на пункце аховы Бабруйскай гарадской падатковай інспекцыі ішла як звычайна. Мноства наведвальнікаў, шум у калідорах. Але паводзіны аднаго грамадзяніна насцярожылі адразу. Той без аніякай мэты блукаў па другім паверсе з чорным чамаданам у руках і прыкметна хваляваўся. Потым завярнуў у прыбіральню, адкуль выйшаў ужо з пустымі рукамі.**

Барадуленка адразу накіраваўся агледзець тое памяшканне. Кінуліся ў вочы выкручаны кран з умывальніка, шырока адчыненае акно, а ўнізе на зямлі — уся ўкрадзеная сантэхніка, набор інструментаў. І той самы чамадан. Дзяжурны экіпаж затрымаў зламысніка па гарачых слядах.

Амаль у той жа час, непадалёку, на аўтастаянцы, мужчына, падыходзячы да свайго аўтамабіля, убачыў узламаны замок багажніка, адкуль зніклі інструменты і прадукты. Хацеў выклікаць дапамогу па тэлефоне, але заўважыў міліцэйскія аўтамабілі каля будынка падатковай інспекцыі. Пабег туды. І толькі паспеў расказаць пра сваю бяду — як адразу «сустрэўся» (вядома ж, з дапамогай вартавых правапарадку) са злодзеем, пры якім быў чорны чамадан, а таксама інструменты з яго. Якраз тое, што і было ўкрадзена з аўтамабіля. Гаспадару тут засталося толькі здзіўляцца: злачынства раскрылі яшчэ да таго, як ён звярнуўся па дапамогу.

**Алена ЯРМАЛІНСКАЯ.**

# ЧЫРВОНКА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

13 ЧЭРВЕНЯ 2013 г.

ЧАЦВЕР

№ 13 (15722)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

# Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА: «ГАЛОЎНАЕ, КАБ НЕ БЫЛО ПОДЛАСЦІ, А З АСТАТНІМ РАЗБЯРУСЯ»



**Спорт — прафесія, якая выпрабоўвае чалавека на вынослівасць і загартоўвае яго характар. Вольга Барабаншчыкава ведае гэта з уласнага вопыту, бо правяла на тэнісным корце не адзін год. Аднак так склалася жыццё, што спартыўная кар'ера завяршылася і прыйшлося шукаць іншую нішу для сябе. Фартуна не пакінула дзяўчыну, і тая трапіла на музычную прастору. Поспех можа стаць білетам да прыгожага жыцця, але вынік патрабуе штодзённай працы. Перш за ўсё над сабой. Магчыма, тут і крыецца сакрэт яе запатрабаванасці. Праца на радыё і тэлебачанні, запіс новага альбома. Шчаслівы збег абставін ці бонус ад жыццёвых перамог? Пра адкрыццё новых прафесійных гарызонтаў, пераемнасць любові да музыкі і недапушчальныя правілы гульні Вольга расказала нашаму карэспандэнту.**

***— Спробы рэалізаваць сябе прывялі вас на радыё «Мір»?***

— Гэта здарылася выпадкова. Мне патэлефанавалі, і я, не доўга раздумваючы, пагадзілася. У мяне часта бываюць інтэрв'ю на радыё, мяне запрашаюць на розныя шоу, таму заўсёды было цікава ведаць, як там працуюць. Пакуль што я з хіт-парадам толькі адзін раз на тыдзень у эфіры. На радыё я атрымліваю тую дозу адрэналіну, якой мне часам не хапае ў жыцці. Спадзяюся, з гэтага эксперыменту атрымаецца нешта цікавае, бо мне важна самаўдасканальвацца.

***— А такога кшталту праграмы, як хіт-парад, патрэбны сёння на радыё?***

— Мне здаецца, безумоўна. Часам, уключаючы радыё, разумею, што проста нецікава слухаць бясконцыя размовы. А ў хіт-парадах менш размоў і больш музыкі. І яны дапамагаюць арыентавацца ў плыні новых кампазіцый, якія з'яўляюцца штодзень. Мае асабістыя музычныя густы не заўсёды супадаюць з фарматам праграмы. Ёсць перспектыва, што з часам з'явіцца мой уласны хіт-парад, дзе я змагу каардынаваць выбар кампазіцый.

***— Якой жа музыцы вы аддаяце перавагу?***

— Тут усё залежыць ад настрою. Вельмі падабаюцца «Cafe Del Mar», розныя арабскія матывы. Усход наогул выклікае вялікую цікавасць, у тым ліку і музыка. Калі я на трэніроўках, то мне патрэбны танцавальныя кампазіцыі. Часам магу і класіку паслухаць. Сярод маіх любімых выканаўцаў таксама Андрэа Бачэлі, піяніст Джым Брыгман. А калі хочацца ні пра што не думаць, то магу і поп-музыку ўключыць.

***— Раскажыце пра свой новы альбом «Мая планета»...***

— Гэта ўжо другі альбом, над якім мы працавалі аж сем гадоў. Кожны год я збіралася яго прэзентаваць, бо была назапашана дастатковая колькасць песень, але неяк зацягнуўся пошук іх гарманічнага спалучэння ў альбоме. І нарэшце я дасягнула сваёй мэты. У альбом увайшла 21 кампазіцыя. Акрамя дыска з песнямі будзе прэзентаваны дыск з відэа, фотаздымкамі і відэакліпамі. Усе творы тут прасякнуты атмасферай кахання. Недзе яно з адценнем суму, недзе — вясёлосці, часам нават іроніі, аднак усюды каханне, каханне... Бо гэта пачуццё, якое натхняе нас на розныя ўчынкі. Яно — самае галоўнае ў жыцці кожнага чалавека.

**(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)**

*Здаёмся!*

# НЕ ХАПАЕ ВЕДАЎ? ЗВЯРНІСЯ... ДА ІНТУІЦЫІ

**Летась удзельнікам цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы была прапанавана наступная задача. На адной чашы ўраўнаважаных шаляў ляжаць 3 яблыкі і 1 груша. На другой — 2 яблыкі, 2 грушы і гірка вагой 20 грамаў. Колькі важыць адзін яблык у грамах, калі ўся садавіна разам важыць 780 г (лічыць усе яблыкі аднолькавымі па вазе і ўсе грушы аднолькавымі па вазе)? Правільны адказ хаваўся сярод пяці варыянтаў: 1) 95 г; 2) 105 г; 3) 100 г; 4) 125 г ; 5) 115 г. Прыкладна 60% абітурыентаў гэтую задачу рашыць не змаглі. А 40% удзельнікаў тэсціравання па матэматыцы ўжо ў іншым заданні не здолелі пазнаць сярод прыведзеных варыянтаў адказаў раўнабедраны трохвугольнік. Два яго вуглы былі вядомыя, а трэці трэба было вылічыць. Элементарнае заданне, але абітурыент павінен быў ведаць, што сума вуглоў трохвугольніка — 180 градусаў, а ў раўнабедраным трохвугольніку два вуглы — роўныя.**

## Пра ламінат і шпалеры задачы не задаваць?

Адзін з самых распаўсюджаных міфаў, звязаных з цэнтралізаваным тэсціраваннем, — існаванне бездані паміж школьнай праграмай і зместам тэстаў. З чым катэгарычна не згодныя арганізатары цэнтралізавага тэсціравання.

— Хачу запэўніць, што да кожнага тэста абавязкова прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: тэст павінен адпавядаць адукацыйнаму стандарту, праграме ўступных іспытаў, а таксама патрабаванням навуковасці і дакладнасці. Пры гэтым правільнасць адказаў не можа быць спрэчнай. Гэта значыць, што яна павінна аднaзначна трактавацца ўсімі падручнікамі для сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў, рэкамендаваных Міністэрствам адукацыі, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — У тэсты, якія выкарыстоўваюцца для правядзення ЦТ, уключаюцца заданні з максімальнай дыферэнцыравальнай здольнасцю, што даюць найбольшы «роскід» у ацэнцы абітурыентаў, і адбракоўваюцца заданні, з якімі не спраўляецца ніводзін з удзельнікаў, паколькі яны, з пункту гледжання ранжыравання абітурыентаў, неінфарматыўныя.

Штогод мы карэкцыруем нашы тэсты з тым, каб «дагадзіць» так званаму сярэднестатыстычнаму абітурыенту. Заданні павінны быць рознай дыферэнцыруючай здольнасці: для моцных — найбольш складаныя, для слабейшых — больш лёгкія. Задача, як вы разумееце, няпростая, і, каб вырашыць яе, часам даводзіцца крыху зніжаць

**Як толькі тэкст задачы становіцца больш груваcткім, адразу прапарцыянальна павялічваецца і колькасць абітурыентаў, якія не спраўляюцца з гэтай задачай.**

складанасць некаторых заданняў. Некаторыя апаненты ЦТ абвінавачваюць тэсты ў тым, што ў іх бракуе творчасці. У той жа час, калі ў тэстах з'яўляюцца задачы, якія патрабуюць пэўнай кемлівасці, нам гавораць, што тэсты залішне складаныя і выходзяць за межы школьнай праграмы. У сувязі з гэтым магу прывесці прыклад, як адна і тая ж задача, але з маленькімі варыяцыямі, па-рознаму ўспрымаецца і рашаецца абітурыентамі. Так, знаходзіць плошчу прамавугольніка ўмеюць амаль усе, але калі ў заданні трэба разлічыць колькасць ламінату для падлогі, то працэнт правільных адказаў істотна скарачаецца. Аднак мы і далей збіраемся ўкараняць у тэсты элементы кампетэнтнаснага падыходу, бо гэта для выпускнікоў школы мае практычную значнасць.

Стваральнікі тэстаў імкнуцца да таго, каб усе задачы ў тэсце былі карэктна сфармуляваны і мелі мінімум тлумачэнняў, бо як толькі тэкст задачы становіцца больш груваcткім, адразу прапарцыянальна павялічваецца і колькасць абітурыентаў, якія не спраўляюцца з гэтай задачай. Заўважана, што сучасныя абітурыенты ў параўнанні са сваімі папярэднікамі горш выконваюць заданні з тэкставай часткай. Мы тлумачым гэта спецыфікай тых носьбітаў інфармацыі, якімі сёння карыстаюцца маладыя людзі, улічваем гэтую тэндэнцыю пры складанні тэстаў і імкнёмся ў сваіх фармулёўках да лаканічнасці.

Увогуле наш вопыт сведчыць, што найлепшыя тыя тэсты, дзе няма ні абсалютных вынікаў, ні нулявых. З іншага боку, наяўнасць стабальных вынікаў сведчыць якраз пра тое, што заданняў, якія нельга рашыць, на цэнтралізаваным тэсціраванні, няма. Летась 100 балаў па розных прадметах атрымалі 193 абітурыенты. А дзве абітурыенткі нават здолелі атрымаць па два стабальныя сертыфікаты.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

*Кампус*

# СТВАРЫЦЬ ГАЗЕТУ... ЗА 24 ГАДЗІНЫ!

**Чамусьці большасць студэнцкіх мерапрыемстваў заўжды прыпадае на вясну. Быццам бы перад цяжкай сесіяй моладзь хоча хаця б на нейкі час забыцца пра вучобу. Бо месяцам пазней такога адчування можа ўжо і не быць... Студэнты Інстытута журналістыкі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі — не выключэнне. Сваё традыцыйнае свята пад назвай «Журналісцкая вясна-2013» яны, як заўжды, правялі ў канцы мая, запрасіўшы паўдзельнічаць у ім сваіх калег з Беларусі.**



Газета за 24 гадзіны ў працэсе падрыхтоўкі.

Кіеўскі журфак маладзейшы за беларускі ўсяго на тры гады — рыхтаваць работнікаў СМІ там пачалі ў 1947-м. А ў 1993 годзе кіеўскі факультэт журналістыкі стаў інстытутам і атрымаў новы будынак. З беларускім тое ж самае адбылося толькі ў 2008-м. Дарэчы, абодва інстытуты дзеляць свой будынак з іншымі ўстановамі: кіеўскі — з Інстытутам міжнародных адносін, мінскі — з факультэтам філасофіі і сацыяльных навук БДУ.

«Кватэрнае пытанне» было вырашана хутка і рацыянальна: гасцей засялілі ў адзін са шматлікіх інтэрнатаў у студгарадку на перыферыі Кіева. Інтэрнат аказаўся самым што ні на ёсць мультыкультурным: акрамя беларусаў, тут жылі кітайцы, каўказцы і студэнты з розных краін Афрыкі. А таму нефармальныя міжнацыянальныя стасункі пачаліся з першай жа хвіліны. А ўвечары беларусы, часам самі таго не жадаючы, знаёміліся з культурай (пераважна, музычнай) краін Пярэдняй Азіі...

Першы дзень — на адпачынак пасля дарогі і хуткае азнаямленне са славутасцямі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта. А таксама, безумоўна, з цэнамі ва ўкраінскай сталіцы. Дарэчы, прыемным фактам стаў курс грыўні да беларускага рубля: пры суадносінах 1 грыўна ≈ 1 000 беларускіх рублёў падлік сродкаў на існаванне значна спрасціўся.

**(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 06 2013 г.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# НЕ ХАПАЕ ВЕДАЎ? ЗВЯРНІСЯ... ДА ІНТУІЦЫІ

**Будзь у курсе:**

*У аснову методыкі разліку тэставага бала была пакладзена 100-бальная шкала, якая дазваляе не толькі прыняць пад увагу колькасць правільна выкананых заданняў тэста, але і ўлічыць адносную складанасць кожнага выкананага ці нявыкананага задання. Пры гэтым складанасць кожнага задання вызначаецца статыстычна, у залежнасці ад колькасці ўдзельнікаў, якія правільна выканалі гэта заданне. Чым большая колькасць абітурыентаў справілася з тэставым заданнем, тым меншы вагавы каэфіцыент яго складанасці. І наадварот, чым менш абітурыентаў справіліся з такім заданнем, тым яго вагавы каэфіцыент вышэйшы. Методыка разліку тэставага бала дазваляе разлічваць як тэставы бал для заданняў з адзіным правільным адказам, так і тэставы бал для заданняў, якія дапускаюць некалькі правільных адказаў.*

## Шукай рацыянальны шлях

Адна з самых распаўсюджаных сярод удзельнікаў ЦТ памылак — гэта ўспрыманне памераў задачы: абітурыентам здаецца, што чым большая па аб'ёме задача, тым больш складана яна рашаецца. На практыцы ў большасці выпадкаў гэта не так. Чым больш аб'ёмная ўмова задачы, тым больш яна змяшчае зыходных даных, падставіўшы якія ў патрэбныя формулы, абітурыент атрымлівае адказ. Галоўнае — умець правільна запісаць кароткую ўмову задачы і выбраць неабходныя формулы, у той час як у задачах з невялікай колькасцю даных усю неабходную інфармацыю для пошуку правільнага варыянта абітурыентам даводзіцца знаходзіць самім.

**Часам нават нязначнае змяненне фармулёўкі задання збівае ўчарашняга школьніка з толку і прымушае ўсумніцца ва ўласных ведах.**

Задача ўдзельніка цэнтралізаванага тэсціравання — выбраць рацыянальны шлях рашэння. Таму калі хтосьці сцвярджае, што рашэнне заняло ў яго некалькі старонак, гэта значыць, што абітурыент выбраў не самы кароткі шлях.

*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».*

Існуюць пэўныя законы пабудовы тэста, згодна з якімі ўзровень заданняў павінен узрастаць: абітурыент пры выкананні тэста рухаецца ад простых да больш складаных заданняў. Заданні часткі А, дзе прапануюцца варыянты адказаў, правяраюць або ўменне лагічна разважаць, або ўменне аналізаваць і хутка рабіць выснову, або выбіраць правільны адказ з падобных. Правільна сфармуляванае заданне патрабуе ўдумлівага аналізу і супастаўлення магчымых варыянтаў рашэння.

А для таго, каб тэст мог больш дакладна пабудаваць рэйтынг удзельнікаў тэсціравання, існуе вобласць В, дзе няма адказаў на прапанаваныя пытанні і задачы. Заданні вобласці В дазваляюць дыферэнцыраваць абітурыентаў з больш глыбокай падрыхтоўкай. Хоць, як паказвае практыка, нярэдка менавіта моцныя абітурыенты спатыкаюцца на простых заданнях.

## Збітыя з толку

Нярэдка, прыйшоўшы на цэнтралізаванае тэсціраванне, абітурыент спадзяецца ўбачыць ужо знаёмыя і адпрацаваныя тыпы заданняў, якія ён неаднойчы рашаў з настаўнікамі ці самастойна. Але часам нават нязначнае змяненне фармулёўкі задання збівае ўчарашняга школьніка з толку і прымушае ўсумніцца ва ўласных ведах. Незнаёмы тып заданняў у некаторых выпадках можа давесці яго да панікі, на пераадоленне якой будзе патрачаны каштоўны час.

Збіць з толку абітурыентаў могуць таксама графічныя выявы заданняў — напрыклад, выкарыстанне кругавой дыяграмы замест звыклага тэксту ў цэнтралізаваным тэсціраванні па матэматыцы.

Асаблівы ўважлівымі абітурыентам трэба быць пры аналізе адказу да задач па фізіцы і матэматыцы. На тэсціраванні па фізіцы тыповыя памылкі абітурыентаў нярэдка звязаны з няўменнем прымяняць законы фізікі ў канкрэтных сітуацыях. Многія ўдзельнікі ЦТ няправільна рашаюць задачы з-за фармальнага ведання фармулёвак асноўных фізічных законаў і матэматычных выражэнняў, няўважлівага прачытання ўмоў задачы. Замест падрабязнага аналізу ўмоў задачы ўдзельнікі тэсціравання спрабуюць проста падабраць формулу і падставіць значэнні зададзеных велічынь. Аднак калі адказ супадае з адным з варыянтаў, гэта яшчэ зусім не значыць, што ён правільны. Таму пры наяўнасці часу варта праправерыць атрыманы вынік.

Калі абітурыент адчувае цяжкасці пры рашэнні задач па фізіцы ці матэматыцы, то адным з дзейсных спосабаў з'яўляецца паўтарэнне на памяць умовы задачы. Таму што даволі часта ўказанне на правільны алгарытм рашэння змешчана ў самой умове задачы, і канцэнтрацыя ўвагі на ёй дапамагае гэты алгарытм распазнаць.

А вось зрокавая памяць можа выратаваць на тэсціраванні па беларускай ці рускай мове. Так, пры неабходнасці вызначыць правільную літару пры напісанні слова, абітурыент можа напісаць абодва варыянты на чарнавіку: а раптам правільны адказ у памяці і з'явіцца? Увогуле сфарміраваныя ў працэсе навучання навыкі і інтуіцыю нельга скідваць з рахунку.

На тэсціраванні па фізіцы і хіміі арганізатары ЦТ нярэдка назіраюць пралікі менавіта ў матэматычнай падрыхтоўцы абітурыентаў, гэта значыць, што, правільна рашыўшы задачу «фізічна», абітурыенты дапускаюць памылкі ў рашэнні сістэмы ўраўненняў, у матэматычных пераўтварэннях формул, пры выкананні дзеянняў з вектарамі, трыганаметрычнымі функцыямі і гэтак далей. Некаторыя абітурыенты памыляюцца пры аналізе графікаў, не могуць прымяніць правілы прыблізных вылічэнняў, правільна акругліць канчатковы адказ. Для таго, каб справіцца з тэстам па фізіцы, неабходна выдатна валодаць усімі матэматычнымі аперацыямі. Зразумела, што ў выйгрышы будуць тыя абітурыенты, у якіх развіты навык вуснага лічэння. Аднак, як запэўніваюць арганізатары ЦТ, на тэсціраванні па фізіцы няма заданняў, дзе была б складаная матэматыка, якая аднімае шмат часу.

— Адразу хачу сказаць, што многія абітурыенты памыляюцца, мяркуючы, што можна якасна падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання за паўгода ці год пры ўмове, калі яны будуць бясконца рашаць тэсты. На жаль, такога меркавання прытрымліваюцца і некаторыя настаўнікі, якія вучаць дзяцей па тэстах. Але ж гэта няправільна! — папярэджвае Мікалай Фяськоў. — Мы не стамляемся паўтараць, што нашы заданні адпавядаюць школьнай праграме, але тэсты не перадаюць усёй паслядоўнасці таго ці іншага курса, а таму рыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання трэба не па тэстах, а па падручніку. Тэст — гэта найперш сродак дыягностыкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Даведка «Звязды»:

*Устаноўлены ў 2012 годзе на цэнтралізаваным тэсціраванні парог у 7 тэставых балаў не змаглі пераадолець больш як 18 тысяч абітурыентаў: меншую колькасць балаў умудрыліся набраць на ЦТ па дзяржаўнай мове 4 603 абітурыенты (або 3,34% ад агульнай колькасці) і 13 631 абітурыент не дацягнуў да ўстаноўленага бар'ера на экзаменах па профільных вучэбных дысцыплінах (5,57%).*

*Сёлета ніжні парог тэставага бала быў павышаны. Для таго, каб мець магчымасць падаць дакументы ў ВНУ, абітурыенты павінны будуць набраць не менш як 10 балаў па рускай і беларускай мовах, 15 балаў — па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі і 20 балаў — па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежных мовах.*

*Пераадолець страх*

# ДЗЕНЬ Х: НАСТРОЙ СЯБЕ НА ПОСПЕХ!

**Існуе нямала досыць простых правілаў і прыёмаў пераадолення экзаменацыйнага стрэсу. Выберыце тыя з іх, якія палічыце найбольш эфектыўнымі для сябе:**

**1.** Падрыхтоўку да іспыту рэкамендуецца скончыць у 17-18 гадзін. У апошнія гадзіны перад экзаменам займацца ліхаманкавым «завучваннем» непрадуктыўна: вопыт паказвае, што чым больш вучыш у ноч перад праверкай ведаў, тым менш іх застаецца ў галаве.

**Вопыт паказвае, што чым больш вучыш у ноч перад праверкай ведаў, тым менш іх застаецца ў галаве.**

**2.** Увечары перад іспытам лепш заняцца любой заспакаяльнай справай, якая адцягвае ўвагу: выйсці на кароткую прагулку, прыняць душ. Для таго, каб «разгрузіць мазгі» напярэдадні іспыту, вельмі карысна паглядзець камедыю або гумарыстычную перадачу. Навукова даказана: смех не толькі здымае стрэс, паляпшае апетыт і працаздольнасць, нармалізуе сон, але і цудадзейным чынам актывізуе разумовыя здольнасці і кемлівасць.

**3.** Перад іспытам важна як след выспацца! Для таго, каб вы без цяжкасці змаглі заснуць, у другой палове дня напярэдадні іспыту выключыце са свайго рацыёну каву, гарбату, шакалад і колу. За 30-40 хвілін да сну карысна выпіць шклянку цёплай вады, у якой трэба растварыць лыжку мёду. Мёд валодае ўласцівасцю ўмацоўваць нервовую сістэму.

**4.** Выкарыстоўвайце псіхалагічную тэхніку «візуалізацыі». Перад сном, лежачы ў ложку ў расслабленым стане, пастарайцеся ўявіць сабе працэс здачы гэтага іспыту. Намалюйце ў думках карцінку, як вы заходзіце ў аўдыторыю, садзіцеся на сваё месца, бераце аркушы паперы і спакойна пачынаеце працаваць, лёгка спраўляючыся з усімі заданнямі. Настройце сябе толькі на поспех!

**Адключыць інтэрнэт, забыцца пра тое, што такое тэлевізар, хоць на некалькі дзён варта.**

**5.** «Паўтарэнне — маці вучэння!» Зараз самы час інтэнсіўна падрыхтавацца. Не есці і не спаць мы, вядома, не прапануем, але вось адключыць інтэрнэт, забыцца пра тое, што такое тэлевізар, хоць на некалькі дзён варта.

**6.** Перад самім іспытам можна з'есці пару кавалачкаў шакаладу — гэта дапаможа сканцэнтравацца на заданні. А яшчэ шакалад з'яўляецца выдатным антыдэпрэсантам: ён і смачны, і карысны, і са стрэсам дапамагае справіцца.

Не трэба зацыклівацца на іспытах і іх баяцца, тым самым даводзячы сябе да панікі і нервовага знясілення. Варта настройвацца толькі на лепшае. Кожны дзень, раніцай і перад сном, паўтарайце: «Я ўсё змагу, я ўсё ведаю». Старайцеся больш гуляць на свежым паветры і правільна харчавацца. Экзамены экзаменамі — а здароўе важней! Выконваючы гэтыя простыя парады, вы зможаце часткова або цалкам пазбавіцца ад страху перад днём «Х», зберагчы здароўе, паспяхова прайсці іспыты і, нарэшце, выправіцца на заслужаны адпачынак.

**Арына КАГАЛЁНАК, вучаніца 9 класа Навапалацкай гімназіі № 2.**

*Без панікі!*

# ДЗІЦЯ — НА ЭКЗАМЕН, А БАЦЬКІ — ЗА ВАЛЯР'ЯНКУ?

**Па назіраннях псіхолагаў, больш за ўсё ўступных выпрабаванняў баяцца... дарослыя. Жорсткія ўстаноўкі бацькоў на пэўныя вынікі могуць адбіцца на эмацыянальным стане дзіцяці. Калі ў сям'і фарміруецца стаўленне да вынікаў экзамену як да звышважных, гэта, безумоўна, павышае ўзровень трывогі ў дзіцяці і боязь не апраўдаць чаканні і ўкладзеныя ў падрыхтоўку да экзамену сродкі і сілы.**

Бацькам трэба аказваць усялякую падтрымку дзіцяці і падчас падрыхтоўкі, і ў перыяд здачы экзаменаў. Яна заключаецца ў фарміраванні ўпэўненасці ў тым, што ў выпадку непаспяховай ці недастаткова паспяховай здачы ўступных экзаменаў у дзіцяці ёсць выбар — прадоўжыць навучанне, напрыклад, у сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе, атрымаць рабочую прафесію, пайсці на курсы і гэтак далей. Павінны прадугледжвацца, так бы мовіць, запасныя варыянты. Асноўная задача бацькоў, па меркаванні псіхолагаў, — захаваць здароўе дзіцяці, мінімізаваць стрэс, забяспечыць дома камфортныя ўмовы і аказаць падтрымку ў выбары прафесіі з улікам вынікаў уступных экзаменаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Конкурс «Новы погляд»*

# ВІНШУЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ!

**Конкурс, які доўжыўся некалькі месяцаў, скончаны. За гэты час рэдакцыя атрымала мноства допісаў ад нашых юных аўтараў з розных куткоў краіны. Лепшыя з гэтых «проб пяра» былі апублікаваны на старонках «Чырвонкі». І вось надышоў лагічны момант: трэба вызначыць пераможцаў... Дакладней, назваць іх імёны, паколькі журы з супрацоўнікаў рэдакцыі шляхам галасавання ўжо прыняло сваё рашэнне.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Прызы для пераможцаў.

Аднак перш чым мы агучым імёны тых, хто даслаў лепшыя творчыя работы, заначым: прайграўшых няма, у конкурсе перамаглі ўсе. Таму што адважыліся падзяльнічаць у ім, таму што прыдумвалі тэмы, працавалі над свaімі, магчыма, першымі ў жыцці журналісцкімі матэрыяламі (няхай многім і дапамаглі бацькі або настаўнікі). Упэўнены, што творчы чалавек, які ўпершыню ўбачыў сваё прозвішча пад газетным матэрыялам (яго матэрыялам!), ды яшчэ ў рэспубліканскім выданні, ніколі не забудзе гэтага адчування!.. Таму і сцвярджаем як людзі, у жыцці якіх калісьці таксама ўпершыню быў такі момант: прайграўшых няма.

Тым не менш, падпарадкоўваючыся ўмовам конкурсу, мы павінны назваць лепшых аўтараў. Зрабіць гэта сапраўды было цяжка! Таму журы нават прыняло рашэнне адзначыць не трох юных карэспандэнтаў, як планавалася першапачаткова, а пяцярых! Такім чынам, увага!!!

Лепшымі матэрыяламі, што паступілі на конкурс «Новы погляд» і былі апублікаваны на старонках «Чырвонкі», журы прызнала допісы: вучаніцы 11 класа Ліцэя БДУ **Кацярыны Жоравай** («Стараста класа — Таня...», «Чырвонка» №24 ад 20.12.2012), вучаніцы 11 класа Падгорненскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна **Тацццяны Лауш** («Я бег босы па гэтым попеле, і адно мае слядочкі заставаліся...», «Чырвонка» №5 ад 6.03.2013), навучэнкі Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа імя А.С.Пушкіна **Кацярыны Лясун** («Вяртанне», «Чырвонка» №7 ад 4.04.2013), вучаніцы 9 класа Пачапаўскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна **Яўгеніі Кандратчык** («След на зямлі», «Чырвонка» №11 ад 16.05.2013), вучаніцы 9 класа Кальчунскай сярэдняй школы Ашмянскага раёна **Інгі Гіз** («Карта яго падарожжаў», «Чырвонка» №12 ад 30.05.2013). Чацвёра з гэтай пяцёркі сталі лаўрэатамі конкурсу «Новы погляд». **А пераможцам журы аднадушна абвясціла Кацярыну Лясун!** Шчыра віншуем усіх аўтараў і зычым ім далейшых творчых поспехаў (спадзяёмся, на старонках «Чырвонкі»)! Пераможца і лаўрэаты конкурсу будуць узнагароджаны ганаровымі дыпломамі Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Звязда», памятнымі прызамі, а старэйшыя дзяўчаты — Кацярына Жорава, Таццяна Лауш і Кацярына Лясун — атрымаюць яшчэ і рэкамендацыі для паступлення на факультэт журналістыкі БДУ.

...Калі коратка прааналізаваць творчыя працы юных карэспандэнтаў, якія паступілі на конкурс (напэўна, усе зараз задаюцца пытаннем: па якіх крытэрыях вызначаліся лепшыя матэрыялы?), трэба адзначыць, што палова з іх была прысвечана тэме роднай мовы, краіне і беларусам. Не можа не радаваць, што прадстаўнікам маладога пакалення неабыякавая гэтая праблематыка, што яны актыўна выказвалі сваю пазіцыю па ёй. Аднак наш конкурс называўся «Новы погляд», што мела на ўвазе аўтарскі позірк і такі ж падыход да нейкай падзеі ці з'явы. Чаму пераможцам стаў допіс Кацярыны Лясун менавіта ў названай «намінацыі»? Па сутнасці, аўтар напісала тое ж, што і іншыя карэспандэнты, але — праз жыццёвую сітуацыю, праз эмоцыі і пачуцці. У матэрыяле амаль няма агульнага, нейкіх адцягнутых развагаў на тэму занападу роднай мовы. Ёсць асабістае. І праз гэта асабістае, вачыма аўтара, мы якраз добра бачым і разумеем праблему. Вяртанне дадому — гэта вяртанне да вытокаў. Матэрыял Кацярыны адначасна невялікі, але ў ім — і ў прамым, і ў пераносным сэнсе — няма лішніх слоў.

Кацярына Жорава паразважала (зноў жа, праз жыццёвы прыклад) на актуальную тэму: хто ён — лідар? Колькі часу таму і цяпер. І што ёсць сапраўднае лідарства, а што — толькі яго падабенства... Матэрыял Кацярыны «чапляе», прымушае задумацца, і менавіта таму яго смела можна назваць сапраўднай журналісцкай працай.

Таццяна Лауш звярнулася да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Гэта вельмі важна — каб цяперашняе пакаленне моладзі памятала пра падзеі тых далёкіх ужо гадоў, ведала, якой цаной і якога ворага мы перамаглі. Аўтар расказвае пра подзвіг сваіх аднавяскоўцаў, якія мужна змагаліся з захопнікамі і якія проста змаглі ацалець у тыя жудасныя часы, што таксама ў пэўным сэнсе можна прыраўноўваць да подзвігу. Подзвігу жыцця насуперак усім памкненням бязлітаснага ворага, які не бачыў месца для многіх народаў на зямлі. Чытаеш успаміны пажылога чалавека, і сэрца літаральна крывёй абліваецца: бягуць дзеці па вёсцы, а за іх спінамі — выбухі снарадаў, і яны ўсё бліжэй...

Яшчэ два лаўрэаты конкурсу — Яўгенія Кандратчык і Інга Гіз — распавялі пра прадстаўнікоў адной з самых важных прафесій — настаўнікаў. Атрымалася нават сімвалічна: Яўгенія напісала пра заслужанага ветэрана, настаўніцу, якая аддала дзесяцігоддзі сваёго жыцця любімай справе, школе і вучням, а Інга — пра маладога педагога са сваёй школы. Розных па ўзросце і месцы жыхарства, гераяў гэтых матэрыялаў яднае аданасць абранай прафесіі, неабыякавасць і творчы падыход у працы.

...Аналізуючы творчыя працы пераможцаў конкурсу, рэдакцыя хацела б звярнуць увагу нашых патэнцыяльных юных і маладых аўтараў: журналістыка — гэта найперш стасункі з людзьмі, а не з інтэрнэтам. Апошні — толькі тэхнічны сродак, які можна і трэба выкарыстоўваць. Але аснова ўсяму — чалавек, яго справы, памкненні, пачуцці. Калі вы будзеце шукаць тэму для свайго допісу, папросту азірніцеся вакол сябе. Вы абавязкова ўбачыце чалавека, які на першы погляд нічым адметным не вылучаецца, але, калі прыглядзіцеся больш уважліва, зразумееце: вось ён, герой нашага часу...

Рэдакцыя «Чырвонкі» не развітваецца з нашымі нештатнымі юнымі аўтарамі. Больш за тое, мы запрашаем да супрацоўніцтва новых маладых карэспандэнтаў, якія спрабуюць сябе ў журналістыцы. Дасылайце нам свае «спробы пяра». Лета — час адпачынку, новых уражанняў і знаёмстваў. Падзяліцеся з чытачамі ўсім гэтым! А мы, са свайго боку, абяцаем, што лепшыя допісы будуць надрукаваны.

**Рэдакцыя маладзёжнага дадатку «Чырвонка. Чырвоная Змена».**

*Зэр гут!*

# ЗАМЕЖНАЯ МОВА ДЛЯ... «УНУТРАНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ»

**Стыпендыят Прэзідэнцкага фонду, якая абараніла кандыдацкую дысертацыю ў 25 гадоў, дацэнт кафедры германскіх моў факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Кацярына Казанкова сцвярджае: з кожным годам матывацыя да вывучэння замежных моў у студэнтаў-першакурснікаў расце, і прычына не ў банальным жаданні выехаць з краіны. З аднаго боку, падыходы да выкладання кардынальна змяніліся, з іншага — у краіне расце колькасць замежных прадстаўніцтваў, беларускіх кампаній, якія працуюць з замежнымі заказчыкамі.**

— Былыя нашы студэнты адкрываюць свае фірмы або становяцца супрацоўнікамі прадстаўніцтваў замежных кампаній у Беларусі ці беларускіх кампаній, якія працуюць на Еўропу, — гаворыць Кацярына. — Самі студэнты расказваюць, што супрацоўнічаюць з ІТ-кампаніямі, якія працуюць на замежны рынак, выкарыстоўваюць нямецкую мову ў зносінах з кліентамі і з краіны паехаць асабліва не імкнуцца. Тавараабарот толькі паміж Беларуссю і Германіяй дасягае некалькі мільярдаў долараў, а ў галіне інвестыцый Германія займае адно з вядучых месцаў у беларускай эканоміцы. У нашай краіне зарэгістраваны сотні прадпрыемстваў з удзелам германскага капіталу, дзейнічаюць дзясяткі прадстаўніцтваў нямецкіх фірмаў. Без ведання замежнай мовы сёння вельмі цяжка дабіцца поспеху ў прафесіі.



***— Чаму ж вы самі не займаецеся бізнесам, калі асвоілі мову на дастаткова высокім узроўні?***

— Кожны павінен займацца сваёй справай. Мне падабаецца вучыць маладое пакаленне. На першы курс прыходзяць студэнты, якія нават не ведаюць нямецкага алфавіта, не ўмеюць чытаць. І вось праз год-два гэтыя студэнты ўжо не толькі ўмеюць размаўляць па-нямецку на бытавыя тэмы, але і выступаюць з навуковымі дакладамі на студэнцкіх канферэнцыях, вядуць дыскусію, адказваюць на пытанні; займаюць прызавыя месцы і атрымліваюць дыпломы за лепшыя праекты. Прычым ацэньваюць іх немцы асабіста. Я лічу, што на ФМА БДУ вучацца вельмі таленавітыя студэнты. З імі хочацца працаваць. Я імкнуся навучыць студэнтаў тым навыкам, якія спатрэбяцца ім у жыцці, перадаць тое, што я пачарпнула падчас замежных стажыровак.

***— У краіну дазваляецца запрашаць замежных выкладчыкаў, калі ў іх ёсць «веды, метады і тэхналогіі інавацыйнага характару», якім яны могуць абучыць беларускіх выкладчыкаў. Гэта мера дастатковая для павышэння кваліфікацыі беларускіх выкладчыкаў?***

— Беларускім выкладчыкам трэба імкнуцца павышаць свой узровень самастойна. Я, напрыклад, у свой час самастойна навучалася ў Ене (ФРГ) на працягу паўгода па нямецкай праграме. Штогод павышаю кваліфікацыю падчас навукова-метадычных стажыровак у Еўропе, выступаю з дакладамі. Публікуюся ў замежных выданнях, у тым ліку ўключаных у прэстыжную базу даных Scopus. З'яўляюся членам профільных міжнародных асацыяцый. Апублікавала манаграфію ў Германіі. Стажыроўкі вельмі карысныя для атрымання замежнага вопыту. Яны дазваляюць наладзіць кантакты і заключаць партнёрскія пагадненні з вядучымі ВНУ свету. Напрыклад, ужо ёсць пэўныя дамоўленасці з некаторымі нямецкімі ўніверсітэтамі для арганізацыі стажыровак выкладчыкаў і студэнтаў ФМА БДУ ў Германіі і, адпаведна, нямецкіх выкладчыкаў у Беларусі.

***— Які міжнародны досвед сёння найбольш запатрабаваны ў сферы выкладання?***

— Па-першае, камунікатыўна-арыентаваны падыход. Ён нацэлены на фарміраванне ў студэнтаў навыкаў зносін у бытавой і дзелавой сферах. На занятках мы адпрацоўваем розныя сітуацыі — напрыклад, вучымся, як дамовіцца аб сустрэчы з дзелавым партнёрам.

Па-другое, мультымедыйныя тэхналогіі. Гэта выкарыстанне ў выкладанні блогаў, вэб-квестаў, а таксама дыстанцыйнае навучанне і мультымедыйныя курсы на вучэбнай платформе Moodle, якая дазваляе студэнтам выконваць заданні ў любы зручны для іх час. Пры дапамозе Moodle пад кіраўніцтвам выкладчыка-цьютара ствараецца дыстанцыйны або камбінаваны курс, які падтрымлівае вочнае навучанне студэнтаў. Дарэчы, у Еўропе ва ўсіх вядучых універсітэтах ёсць платныя дыстанцыйныя спецкурсы. На гэтым нашы ВНУ маглі б самі зарабляць грошы. Планую распрацаваць такі курс і ў нас.

Адзін з цікавых мультымедыйных праектаў, які мне ўдалося рэалізаваць сёлета на ФМА пры падтрымцы Інстытута нямецкіх даследаванняў, DAAD, Пасольства Германіі ў Мінску і Інстытута імя Гётэ, — конкурс відэаролікаў. Студэнты самастойна здымалі відэаролікі пра факультэт на нямецкай мове, іх ацэньвалі немцы. Гэты праект — прыклад рэалізацыі прынцыпу аўтаномнага навучання, калі студэнт працуе самастойна. Гэта актуальна ва ўмовах падрыхтоўкі ўступлення Беларусі ў Балонскі працэс, а таксама скарачэння тэрмінаў навучання ў беларускіх ВНУ.

***— Ваша дысертацыя абапіраецца на гуманітарныя навукі, філалогію. Не сакрэт, што сёння ў Беларусі ВАК не вельмі ахвотна зацвярджае такія тэмы. Як удалося абараніцца?***

— У першую чаргу, дзякуй майму навуковаму кіраўніку, доктару навук Ніне Барысаўне Мячкоўскай. Па-другое, вывучаючы сучасныя літаратурныя творы на рускай, беларускай і нямецкай мовах, я прыйшла да высновы, што ў іх ёсць агульныя камунікатыўныя заканамернасці, і даказала гэта статыстычна, хоць гуманітарыі рэдка прыцягваюць статыстычны апарат. Зараз планую напісаць доктарскую ў рамках камунікатыўнай лінгвістыкі, паколькі яна мае яўнае практычнае значэнне: вывучае прынцыпы эфектыўных, паспяховых зносін. На жаль, для доктарскай не так лёгка знайсці навуковага кансультанта ў нашай краіне. У 2012-м, падчас навуковай стажыроўкі ў Гамбургу, былі прапановы застацца ў Германіі для напісання доктарскай дысертацыі. Я адмовілася. Справа ў тым, што ў нас больш высокая планка для доктарскіх, і дысертацыі, абароненыя ў Германіі, у нас ВАКам не прызнаюцца. А мне б хацелася са статусам доктара навук усё ж жыць і працаваць у Беларусі.

***— Навуковая дзейнасць — самамэта?***

— Не зусім. Аўтаномная праца пад кіраўніцтвам вопытнага кіраўніка сур'ёзна развівае мысленне. Навыкі, атрыманыя падчас самастойнай працы, спатрэбяцца і ў жыцці. Таму, як член Савета маладых вучоных ФМА, я стараюся перадаць студэнтам веды, атрыманыя падчас навуковай працы, данесці да іх думку, што навука дапаможа ім у жыцці, бо сур'ёзна развівае логіку, без якой складана ўявіць паспяховую прафесійную дзейнасць. Вельмі важна навучыць студэнтаў правільна пісаць навуковыя работы і якасна рабіць вусныя даклады па міжнародных стандартах.

**Віктар АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 06 2013 г.

«Зялёная» школа

# КАЛІ ЛЕС — БЛІЖЭЙ НЕ БЫВАЕ

РЭПАРТАЖ СА ШКОЛЬНАГА ЛЯСНІЦТВА

**Сядзець за партамі і глядзець у падручнікі ці прагульвацца ў лесе, паралельна засвойваючы вучэбны матэрыял, падмацаваны нагляднымі прыкладамі, якія растуць і бегаюць тут жа? Зразумела, большасць школьнікаў спыніць свой выбар на апошнім. Гарадскім вучням такая раскоша не заўжды даступная. Але калі ты жывеш у вёсцы, а лес вось ён — за вокнамі школы, чаму б не скарыстацца магчымасцю і не стаць членам школьнага лясніцтва? Навошта цэлы год назіраць за сасной, як можна збудаваць бізнес на веніках і што такое экалагічная сцежка, — даведаемся з рэпартажу карэспандэнтаў «Чырвонкі»...**


Школьнае лясніцтва ў вёсцы Заастравечча.

...Збочваем з асфальтаванай дарогі да акуратных двухпавярховак. Вуліцы амаль пустыя ў будны дзень. Мы ў Клецкім раёне, у пасёлку Рассвет. Калі спыняемся ля школы, разумеем, што школьнага лясніцтва тут папросту не магло не быць. Адразу за агароджай — лес. Бліжэй не бывае. Але для вучняў гэта не толькі месца, дзе можна павесіць кармушкі ці шпакоўні, абгарадзіць мурашнікі ці прыбраць буралом.

— Летась дзеці вывучалі, напрыклад, уздзеянне грыба-губы на высыханне сасны. З даследчымі працамі нашы вучні ўдзельнічаюць у самых розных конкурсах, прывозяць дыпломы. Тэма экалогіі стала блізкай нам даўно, гадоў дваццаць таму. Галоўная прычына зразумелая — побач лес. Дзеці пачынаюць цікавіцца справамі лясніцтва яшчэ ў пачатковых класах, — расказвае нам дырэктар Рассвецкай сярэдняй школы Сяргей Дубман.

Даследаванні для экалагічных праектаў, як правіла, вядуцца на працягу года. Напрыклад, за той жа сасной трэба назіраць на ўсіх стадыях яе існавання, пачынаючы ад прабуджэння вясной і заканчваючы зімовым перыядам. Аліне Гладковай, якая зараз вучыцца ў дзясятым класе, даводзілася выступаць з экалагічным праектам, прысвечаным прычынам высыхання сасны. Дзяўчына прызналася, што весці назіранні — досыць цікавы занятак:

— Калі спатрэбілася выступіць перад вялікай колькасцю людзей і расказаць усё пра свой праект, было даволі страшна: мне больш падабаюцца даследаванні і назіранні. Але настаўнікі вельмі стараліся мяне падбадзёрыць, таму ўсё атрымалася.

Але рассвецкіх школьнікаў вабіць не толькі экалогія. Таксама цікавая для вучняў тэма — энергазберажэнне. Адзін з апошніх іх праектаў — генератар, які выпрацоўвае энергію дзякуючы вадзе, што выкарыстоўваецца для патрэб школы. Гэта дапамагае зберагаць ваду і адначасова — выпрацоўваць энергію. Праўда, ажыццяўленне такіх ідэй школа пакуль не практыкуе.


Аляксандр Гаршкоў — школьны «ляснічы».

— Мы толькі даем бачанне таго, як усё магло б быць, — гаворыць дырэктар Сяргей Дубман.

Каб адпачыць ад напружанай разумовай працы, дастаткова прагуляцца па спецыяльнай экалагічнай сцежцы: пэўным маршруце са стаянкамі, кожная з якіх мае сваю назву — «возера», «мурашнік», «дубовая паляна», «малеча». Апошняя — спецыяльна для пачатковых класаў, урокі «Чалавек і свет» часам праводзяць на гэтай стаянцы. Яна знаходзіцца недалёка ад школы, таму малечы не трэба доўга хадзіць.

Адна са спраў, якой таксама займаюцца ўдзельнікі школьнага лясніцтва, — пасадка дрэў. Але здараецца, што іх трэба не толькі саджаць, а яшчэ і расчышчаць, рабіць так званыя санітарныя высечкі, калі, напрыклад, бяроза ў нейкай пасадцы лічыцца пустазеллем. У Рассвецкай школе прыдумалі: дзеці з галінак зрэзаных дрэў вяжуць венікі, якія пасля прадаюць усім ахвотным, у школы нават ёсць свая бізнес-кампанія. Майстэрства асвойваюць не толькі хлопчыкі — і дзяўчынкі з венікамі цудоўна спраўляюцца. За апошні год школа зарабіла на такім занятку каля 20 мільёнаў рублёў, прадаўшы каля 5 тысяч венікаў. У выніку набылі некалькі ноўтбукаў, відэаўстаноўкі і інтэрактыўную дошку...

...Гледзячы на лес за школьнымі вокнамі, мы адназначна для сябе вырашылі, што калі б былі вучнямі, ні за што б не ўседзелі на занятках, калі на вуліцы надвор'е, якое так і спакушае ўцячы на гадзінку-другую ў лес.

— Не, у нас не прагуляеш, — запэўнілі настаўнікі.

Неабходнасць добрасумленна наведваць заняткі хутка стала нам зразумелай — у школе ўсяго 106 вучняў: калі хтосьці не прыйшоў, гэта адразу відаць...

...Школьнае лясніцтва ў Клецкім раёне ёсць і ў вёсцы Заастравечча, якую мы таксама наведалі. Тут у некаторых вучняў нават ёсць спецыяльная форма зялёнага колеру.

— У нашым школьным лясніцтве займаецца 30 чалавек, пераважна вучні 8-10-га класаў, — пачала аповед настаўніца геаграфіі Вольга Несцер. — У нас ёсць свае ляснічы — Гаршкоў Саша, а Вадзім Шпартаў, Уладзіслаў Цісіневіч і Іван Гаўрук займаюцца ў школе юных лесаводаў пры Рэспубліканскім экалагічным цэнтры.

Больш падрабязна пра сваё захапленне расказалі самі хлопцы. Аказваецца, такія заняткі прадугледжваюць выкананне заданняў практычнага характару. Напрыклад, з мая па кастрычнік трэба назіраць за елкай.

У школьным лясніцтве Заастравецкай сярэдняй школы таксама ёсць і дзяўчаты.

— Больш цяжкую работу мы робім без дапамогі дзяўчат, а вось, напрыклад, прыбраць лес ад смецця ўжо можна пайсці ўсім разам, — патлумачылі хлопцы.

**Аднойчы з сябрам, які прыехаў з горада, пайшлі ў лес. Адразу заўважыў, што мы паводзім сябе там зусім па-рознаму: я гэты лес ведаю, а ён зусім не арыентуецца, дзе мы, здзіўляецца ўсяму навокал.**

Школьнае лясніцтва, дарэчы, сустрэла нас выключна ў мужчынскім складзе, дзяўчаты былі занятыя на нейкім мерапрыемстве, таму праверыць словы заастравецкіх джэнтльменаў не ўдалося. Затое хлопцы распавялі нам пра 12 гектараў лесу, пасаджанага імі летась, пра розныя прыродаахоўныя акцыі, выпускнікоў школы, якія пасля лясніцтва школьнага цяпер працуюць у сапраўдным, а таксама правялі экскурсію па тэрыторыі школы, дзе мы пабачылі музей прыроды, безліч клумбаў, штучны вадаспадзік, спецыяльную сцежку, па якой трэба хадзіць басанож, бо яна выслана дрэвам, каменем, пяском і іншымі матэрыяламі, якія адрозніваюцца адзін ад аднаго навобмацак. У цёплы час года вучні на перапынках амаль не ходзяць па школьных калідорах, усе спяшаюцца на вуліцу.

Напрыканцы мы пацікавіліся ў «ляснічага» Сашы Гаршкова, што яму даюць заняткі ў школьным лясніцтве. Хлопец крыху задумаўся:

— Па-мойму, карысна навучыцца шанаваць прыроду і разумець яе. Аднойчы з сябрам, які прыехаў з горада, пайшлі ў лес. Адразу заўважыў, што мы паводзім сябе там зусім па-рознаму: я гэты лес ведаю, а ён зусім не арыентуецца, дзе мы, здзіўляецца ўсяму навокал.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Мінск — Клецкі раён — Мінск.*


Вучні з задавальненнем даглядаюць залатую рыбку ў «жывым кутку».

ДАСЛОЎНА

## Прафарыентацыя са школьнай лаўкі

**Прэс-сакратар Міністэрства лясной гаспадаркі Ружэна НАВІЦКАЯ:**

— Канец 1960-х—пачатак 1970-х гадоў быў адзначаны актывізацыяй дзіцячага руху па ўсіх напрамках пазашкольнай працы. Менавіта ў гэты час ствараліся атрады «зялёных» патрулёў, вытворчыя атрады і брыгады, школьныя лясніцтвы. Гэтая форма пазашкольнай работы неўзабаве атрымала ўсеагульнае прызнанне на ўсёй тэрыторыі СССР. У 1985 годзе ў Беларусі дзейнічала 927 школьных лясніцтваў. Яны працавалі круглы год. З развалам Савецкага Саюза назіраўся рэзкі спад і ў дзейнасці школьных лясніцтваў. Іх тады засталося толькі 675.

Але, як вядома, праца па лясной і экалагічнай асвеце, прафарыентацыі моладзі пачынаецца са школьнай лаўкі. Зараз у большасці раёнаў краіны ў сярэдніх агульнаадукацыйных школах дзейнічаюць школьныя лясніцтвы, у якіх займаюцца падлеткі, што маюць цікавасць да лесу і яго насельнікаў. Сёння ў Беларусі зарэгістравана каля 700 школьных лясніцтваў, якія аб'ядноўваюць каля 12 тысяч навучэнцаў. Пры падтрымцы Мінлясгаса вядзецца праца па стварэнні ў лясгасах доследна-вытворчых і дэманстрацыйных лясных аб'ектаў для прафесійнага навучання школьнікаў, арганізуюцца музеі прыроды і дэндрарыі. Штогод школьныя лясніцтвы аказваюць вялікую дапамогу лясгасам у правядзенні лесагаспадарчых работ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Пачні з сябе

# БЕРАГЧЫ І ЛЮБІЦЬ

**Чарговы суботнік, чарговае прыбіранне парку... Не, мне не цяжка. Праз гэты парк я праходжу кожны дзень, і, вядома, будзе больш прыемна бачыць кветкі, а не раскіданыя бутэлькі, акуратныя дарожкі, а не кучы смецця. Але толькі адно мне не зразумела: вакол прыстойныя, адукаваныя, інтэлігентныя людзі, якія клапоцяцца аб сваім знешнім выглядзе, аб сваім жыллі... Але чамусьці стан нашага агульнага «зялёнага дома» іх не хвалюе зусім.**

Яны не дазваляюць сабе раскідваць па кватэры смецце, але ім і ў галаву не прыйдзе падняць з зямлі і выкінуць у спецыяльны кантэйнер паперку. Больш за тое, яны ўпэўнены, што самі насмеціць могуць. Нехта кіне недакурак, іншы пластыкавую бутэльку, хтосьці — газету. А ці ведаеце вы, што выкінутая газета будзе раскладацца паўтара месяца, а гэты самы недакурак — на працягу 10-12 гадоў? Няўжо так цяжка выкінуць яго ў адзін са смеццевых бакаў, якія стаяць амаль на кожным кроку? Здаецца, дробязь. Але якраз з такіх дробязяў і складваецца стан экалогіі ў цэлым.

Колькі гадоў спатрэбіцца для таго, каб навучыць грамадства сартаваць смецце па розных кантэйнерах, а не высыпаць яго побач з забітым смеццеправодам на лесвічнай пляцоўцы або дзе-небудзь «за рагом»? Знакаміты Гогаль у сваёй камедыі «Рэвізор» вельмі трапна ахарактарызаваў стаўленне рускага чалавека да смецця: «Кепскі народ! Толькі дзе-небудзь пастаў які-небудзь помнік ці проста плот — чорт іх ведае адкуль і нанясуць усякай дрэні!» Калі так пойдзе далей і людзі не зменяць свайго стаўлення да прыроды, дык праз некалькі стагоддзяў наша планета будзе нагадваць мульцік «Вал-і»: смецце пакрые ўсю тэрыторыю і існаванне на ёй стане немагчымым.

Прырода нашай краіны здзіўляе і захапляе. У Беларусі 21 тысяча рэчак, 11 тысяч азёр і каля 150 вадасховішчаў. А колькі ў нас лясоў! Мы жывём у такім прыгожым месцы, але часам не можам ацаніць і зберагчы ўсё гэта багацце. І часта нават наадварот — руйнуем і знішчаем. Многія рачныя аб'екты засмечаны прамысловымі адходамі, расце колькасць прадпрыемстваў, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе. Так, воды Заходняй Дзвіны на некаторых участках змяшчаюць азот у нітрытный форме ў 10—20 разоў больш за дапушчальныя нормы.

Знішчаючы прыроду, чалавек не ўсведамляе, што гіне сам. Бо яго здароўе і дабрабыт залежаць ад навакольнага асяроддзя. Таму праблемы экалогіі павінны быць найважнейшым пытаннем для людзей усіх узростаў і нацый. Толькі сумеснымі намаганнямі, а таксама пры адказным стаўленні да навакольнага асяроддзя, можна захаваць прыроду і перадаць яе багацце і прыгажосць наступным пакаленням.

У прыродзе ўсё ўзаемазвязана. Беражыце і любіце прыроду, прымнажайце яе багацці, турбуйцеся пра яе, і яна адкажа вам тым жа.

**Арына КАГАЛЁНАК,**
**вучаніца 9 класа**
**Наваполацкай гімназіі №2.**

Смачна есці!



Памер не мае значэння.

# КАМУ ВУЧОБА «ПА ЗУБАХ»,

## альбо Сакрэты студэнцкай кухні

**Як дзейныя студэнты, адказна заяўляем: вучыцца з пустым страўнікам — задача не з простых. А для некаторых навучэнцаў думкі пра ежу часам і ўвогуле становяцца падчас пар тэмай нумар адзін. Таму прыемна было пачуць, што нядаўна Міністэрства гандлю ўзнагародзіла тыя сталовыя для навучэнцаў, што з задачай сканцэнтраваць увагу студэнтаў толькі на вучобе справіліся на «выдатна». Адным з пераможцаў у намінацыі «Лепшы гандлёвы аб'ект грамадскага харчавання пры ўстанове сярэдняй спецыяльнай адукацыі» стала сталовая Камбіната школьнага харчавання Кастрычніцкага раёна г. Мінска. Яе супрацоўнікі лепш за іншых накармілі сваіх наведвальнікаў — навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў. Карэспандэнты «Чырвонкі» завіталі ў згаданы каледж, каб даведацца, чым жа гэтая сталовая адрозніваецца ад іншых і, безумоўна, пад'есці.**

Памер не мае значэння. Такое першае ўражанне пакідае сталовая каледжа мастацтваў. Усяго з два дзясяткі сталоў і кароценькая раздача — усё гэта на плошчы не больш за 50 квадратных метраў. Усё размешчана максімальна кампактна, але наведвальнікі не замінаюць адно аднаму.

Штат тут таксама маленькі: усяго тры чалавекі — повар, загадчык вытворчасці (якая адначасова яшчэ і прадавец), а таксама посудамыйшчыца. Ролю назіральнікаў за парадкам выконваюць два дзяжурныя — звычайная школьная практыка. На момант нашага візіту аранжавыя фартухі на сябе прымерылі дзве навучэнкі III курса спецыяльнасці «Харавое дырыжыраванне». З адной з іх, Віялетай Гардзіеўскай, мы і паразмаўлялі.

**— Віялета, як ты думаеш, чаму менавіта вашу сталовую прызналі лепшай у Мінску?**

— У нас вучацца пераважна дзяўчаты, хлопцаў амаль няма. Але нават такая пераборлівая ў плане ежы аўдыторыя, па-мойму, задаволеная. Усім падабаецца, мне — у прыватнасці.

Успамінаю ўласны негатыўны досвед і пытаюся, ці многа «чужых» людзей наведвае сталовую. Хаця сам бачу, што без месца ніхто не застанецца, увесь час два-тры сталы застаюцца свабоднымі.

— Некаторы час у нас сапраўды існавала такая праблема, калі ў сталовую прыходзіла занадта шмат людзей «з вуліцы», — распавядае **загадчык па вытворчасці Ірына МАТАЛЫГА**. — Зусім побач бальніца хуткай дапамогі, іншыя арганізацыі. Вы ж самі бачыце: сталовая ў нас зусім маленькая, разлічвалася яна толькі на навучэнцаў. Таму, калі людзей стала зашмат, мы пачалі спыняць продаж староннім людзям. І зараз вы наўрад ці сустрэнеце тут тых, хто не вучыцца і не працуе ў каледжы. Ёсць толькі адна невялікая фірма, супрацоўнікаў якой мы кожны дзень кормім па безнаяўным разліку.

**— А вы ведаеце, за што сталовая атрымала ўзнагароду?**

— Магу толькі здагадвацца. Магчыма, перавага ў тым, што ўсе скаргі і пытанні адносна нашай працы не ідуць куды-небудзь «наверх», а застаюцца тут. Дзяўчынкі вось падыходзяць і кажуць: «Сёння тое і тое мне не спадабалася». І я адразу спрабую знайсці нейкае вырашэнне праблемы. Усіх ведаю ў твар, таму працаваць мне лёгка. Ці сапраўды мы такія добрыя — трэба пытацца ў студэнтаў.

**Ацэньваць гастранамічныя якасці заўжды складана. Але ежа сапраўды смачная. Порцыі вялікія, чаго некаторым іншым сталовым не хапае. Пасля добрага сняданку падняцца са стула не так і проста, але прыходзіцца.**

Слухаемся парады спадарыні Маталыгі і падсаджваемся да навучэнцаў, занятых сняданкам.

— У сталовую я прыходжу ледзь не пасля кожнай пары — надта люблю есці, — смяецца **студэнтка III курса спецыяльнасці «Харэаграфія» Ульяна МАСТЫКА**. — У дзень выдаткоўваю на ежу каля 20 тысяч рублёў. Стравы мне падабаюцца. Што хацелася б памяняць? Не ведаю, усё выдатна, вось толькі б часцей бульбяное пюрэ давалі.



Ірына МАТАЛЫГА разлічвае пакупнікоў.

**У сталовую кожны дзень прыходзяць, па нашых падліках, 98 працэнтаў навучэнцаў. У іх заўжды ёсць выбар, што з'есці, ніхто не застаўляе набываць так званыя «комплексы». Можна ўзяць «першае», «другое» і гэтак далей, а можна проста перакусіць булачкай.**

Заахвочаныя гэтымі словамі, становімся ў канец чаргі. Асартымент у сталовай — самы звычайны. Салаты, два варыянты «першага», вялікі выбар «другога» і гарніраў. Булачкі, гарбата — усё, як у любой іншай установе падобнага кшталту. Магчыма, толькі ёгурты і малако ў 200-грамовых упакоўках не ў любой сталовай сустрэнеш. На раздачы размаўляем з **Алесяй САВІЦКАЙ, поварам IV разраду**.

**— А можа, вы ведаеце, чаму работу вашай сталовай так высока ацанілі?**

— Шчыра сказаць, не ведаю. Нічога асаблівага менавіта для перамогі ў конкурсе мы не рабілі.

Садзімся за стол з «поўным наборам» згаладалага студэнта, а таксама адчуваннем уласнай годнасці і разборлівасці. Адчуць сябе рэстаранным крытыкам у звычайнай сталовай каштуе нядорага. Укласціся ў 25 тысяч можна без праблем. Атрымліваецца нешта каля паловы мільёна рублёў на месяц. Згадзіцеся, не самы цяжкі варыянт для студэнцкага кашалька.

Ацэньваць гастранамічныя якасці заўжды складана. Але ежа сапраўды смачная. Порцыі вялікія, чаго некаторым іншым сталовым не хапае. Пасля добрага сняданку падняцца са стула не так і проста, але прыходзіцца.

Сталовая каледжа мастацтваў пакідае сапраўды прыемныя ўражанні: яна чыстая, недарагая і кормяць там смачна. Але ўсё ж — чаму яна лепшая ў горадзе? З гэтым пытаннем мы тэлефануем **Ірыне АНГЕРЧЫК, дырэктару Камбіната школьнага харчавання Кастрычніцкага раёна г. Мінска.**

— Каб адказаць на ваша пытанне, трэба параўнаць нашу сталовую з іншымі канкурсантамі. Акрамя інтэр'еру, сучаснай раздачы, мы прапаноўваем нашы стравы з самай нізкай нацэнкай. Усё ж такі тут вучацца звычайныя дзеці, якім можа банальна не хапаць грошай на поўны абед. Вось мы і зніжаем сабекошт усімі магчымымі метадамі. У нас ёсць пастаянныя пастаўшчыкі прадукцыі, наладжана стабільная дастаўка сыравіны. Ёсць, дарэчы, і свой кандытарскі цэх. Менавіта таму ў сталовую кожны дзень прыходзяць, па нашых падліках, 98 працэнтаў навучэнцаў. У іх заўжды ёсць выбар, што з'есці, ніхто не застаўляе набываць так званыя «комплексы». Можна ўзяць «першае», «другое» і гэтак далей, а можна проста перакусіць булачкай. Сёння мы зарабляем самі на сябе і ўжо выйшлі на самаакупнасць. Вось і ўвесь сакрэт.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. Фота Надзеі БУЖАН.**

# СТВАРЫЦЬ ГАЗЕТУ... ЗА 24 ГАДЗІНЫ!

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Другі дзень быў поўнасцю аддадзены аднаму з самых вядомых і папулярных мерапрыемстваў «Журналісцкай вясны» — «Газеце за 24 гадзіны». Па правілах конкурсу некалькі каманд роўна за суткі ствараюць сваё непаўторнае выданне на пэўную тэматыку. Выкарыстоўваць чужы матэрыял забараняецца: увесь кантэнт выдання ствараюць самі ўдзельнікі. З апошняй секундай адліку гадзінніка гатовыя газеты здаюцца арганізатарам. Пасля гэтага журы з выкладчыкаў кіеўскага журфака ацэньвае працы і вызначае пераможцу.

На гэты раз у конкурсе паўдзельнічалі толькі дзве каманды: беларуская і ўкраінская. А да правілаў быў далучаны яшчэ адзін пункт: госці павінны былі адну старонку прысвяціць Украіне, а гаспадары — Беларусі. Тэматыка выданняў: уздзеянне журналістыкі на грамадства. Два «штабы» разварнуліся ў пакоі на першым паверсе інтэрната Інстытута журналістыкі, непадалёку ад цэнтра Кіева. Тут жа ўсталявалі камеру, якая транслявала ўсе падзеі ў інтэрнэт. Стартавала мерапрыемства ў 12:00.

Светлая палова сутак была выкарыстана камандамі для збору інфармацыі: нехта прапаноўваў кіяўлянам параўнаць беларускі шакалад «Алёнка» з мясцовай «Оленкой», нехта знаёміўся з аднаўленым пасля «Еўра-2012» стадыёнам «Алімпійскі», іншыя малявалі шаржы і хадзілі па чыгуначным вакзале з высунутымі з кішэні грашыма — ці ўкрадуць? Да захаду сонца ўсе ўдзельнікі вярнуліся ў памяшканне імправізаванай рэдакцыі — пісаць тэксты. Моўнае пытанне было вырашана шляхам кампрамісу: палова на беларускай, палова — на рускай.

Меў тут месца і невялікі сабатаж: кампанейскія (і галодныя) беларусы а дзявятай гадзіне пачалі накрываць стол з прывезеных з сабою прадуктаў. І, вядома, частаваць імі «мясцовае насельніцтва». Таму замест журналісцкай працы ўдзельнікі і шматлікія гледачы да апоўначы каштавалі айчынную каўбасу, сыр і квас. А сапраўднае стварэнне газеты пачалося толькі праз 12 гадзін пасля старту.

**Па правілах конкурсу некалькі каманд роўна за суткі ствараюць сваё непаўторнае выданне на пэўную тэматыку. Выкарыстоўваць чужы матэрыял забараняецца: увесь кантэнт выдання ствараюць самі ўдзельнікі.**



Беларускія студэнты на фоне КНУ імя Шаўчэнкі.

Матэрыялы былі здадзены праз 6 гадзін, і да працы прыступілі галоўны рэдактар, вярстальшчык і іх памочнікі. Астатнія разышліся, аб'яднаныя адным жаданнем — паспаць. За 6 гадзін дванаццаціпалоснік быў вычытаны і звярстаны. Роўна праз суткі з пачатку спаборніцтваў арганізатары забралі электронныя варыянты газет у абедзвюх рэдакцый. Заставалася толькі чакаць вынікаў.

Трэці дзень у беларускай каманды абсалютна выпаў з графіка. Усе адсыпаліся і адкормліваліся пасля вельмі няпростага спаборніцтва. А раніца дня чацвёртага пачалася з аб'яўлення вынікаў конкурсу. Як гэта часта бывае, прадстаўнікі журы ў адзін голас заяўлялі, што каманды былі амаль роўныя і пераможцу вызначыць было неймаверна цяжка. І пасля доўгіх спрэчак першынство было аддадзена камандзе з Беларусі. Ужо пасля праяў бурнай радасці і абдымкаў журы талерантна канстатавала: «Газета вельмі цікавая і якасная, але шмат памылак у рускай мове». Усе нашы ад душы парадаваліся, што ўкраінскія спецыялісты беларускай мовы не ведалі.

Ацэньваючы перамогу беларусаў, трэба, безумоўна, браць пад увагу і той факт, што ў зборную сапернікаў уваходзілі пераважна студэнты малодшых курсаў, бо старэйшыя былі заняты падрыхтоўкай да сесіі і практыкі (украінцы праходзяць яе ўвесну, а не восенню, як у нас). У сваю чаргу беларусы заявілі на спаборніцтвы студэнтаў усіх курсаў і самых розных спецыяльнасцяў.

Чацвёрты і пяты дні былі насычаны самымі рознымі, але ўжо больш звыклымі для гасцей мерапрыемствамі. Гэта, у першую чаргу, майстар-класы ад прызнаных майстраў украінскай журналістыкі, якія распавядалі пра апошнія тэндэнцыі ў медыяпрасторы нашай паўднёвай суседкі. Асобным пунктам можна выдзеліць наведванне Кіеўскага тэлецэнтра. Нельга не ўзгадаць і конкурс «Містар журфак», на якім студэнты выбіралі самага выбітнага студэнта інстытута. Дарэчы, забаўляльная праграма ўвогуле аказалася вельмі насычанай: у пятніцу вечарам ва ўнутраным дворыку факультэта прайшоў бясплатны дабрачынны рок-канцэрт пад назвай Rock'Day. Па танцавальнай пляцоўцы з невялікай скрынкай хадзілі дзяўчаты, і кожны, у каго былі грошы, мог ахвяраваць іх на дапамогу аднаму з дзіцячых дамоў Кіеўскай вобласці.

**Два «штабы» разварнуліся ў пакоі на першым паверсе інтэрната Інстытута журналістыкі, непадалёку ад цэнтра Кіева. Тут жа ўсталявалі камеру, якая транслявала ўсе падзеі ў інтэрнэт.**

Нягледзячы на вялікую колькасць сапраўды цікавых мерапрыемстваў, напэўна, найбольш інфарматыўнымі і карыснымі для беларусаў былі самыя звычайныя размовы з «калегамі» па вучобе з Украіны. Моўны бар'ер быў пераадолены лёгка і хутка: многіх здзівіла, як лёгка беларусы разумеюць украінскую мову і наадварот.

Субота была апошнім, шостым днём «ЖурВясны». Урачыстае закрыццё, на якое запрасілі выпускнікоў кіеўскага журфака розных гадоў, прайшло надзвычай весела. Палітру самых розных выступоўцаў — акрабатаў, танцораў, спевакоў — трапна дапоўнілі і беларусы, якія спелі знакамітае «А ў полі тры крынічанькі» ды яшчэ і станцавалі. Знайшлося месца і для традыцыйнага абмену падарункамі і словамі падзякі адно аднаму. А адна з выпускніц Інстытута журналістыкі 1983 года ўзгадала, што ў свой час ім таксама давялося правесці такі ж абмен вопытам паміж Мінскам і Кіевам, калі ў два бакі паехалі студэнты-журналісты БДУ і КНУ.

Беларусы развітваліся з Кіевам у дзень свята ўкраінскай сталіцы. Паспелі паглядзець на Хрышчацік ды Майдан, спусціцца ў пячоры знакамітай Лаўры, пабываць на самай глыбокай станцыі метро ў свеце. А таксама паабяцаць не спыняцца на дасягнутым. Кіяўляне з радасцю пагадзіліся нанесці візіт ў адказ — наведаць Зімнюю школу журналістыкі ў беларускай сталіцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 06 2013 г.

## Острошицкий сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь | Наличие инженерных сетей | Кадастровая стоимость, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Расходы по изгот. докум., бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Зыково, уч. № 1<br>Кадастровый номер 623286301601000088 | 0,1042 | Электричество, газ, водоснабжение | 16 227 100 | 2 434 100 | 5 855 200 |
| 2 | д. Зыково, уч. № 2<br>Кадастровый номер 623286301601000089 | 0,1110 | Электричество, газ, водоснабжение | 17 286 050 | 2 592 900 | 5 855 200 |
| 3. | д. Зыково, уч. № 3<br>Кадастровый номер 623286301601000090 | 0,1142 | Электричество, газ, водоснабжение | 17 784 400 | 2 667 700 | 5 855 200 |
| 4. | д. Зыково, уч. № 4<br>Кадастровый номер 623286301601000091 | 0,1005 | Электричество, газ, водоснабжение | 15 650 900 | 2 347 650 | 5 855 200 |
| 5. | д. Метличино, ул. Центральная, д. 34А<br>Кадастровый номер 623286305101000064 | 0,14 | Электричество. Ограничения: водоохранная зона реки Веснянка | 18 826 100 | 2 823 900 | 4 869 050 |
| 6. | д. Мончаки, уч. № 1, ул. Центральная, д. 3<br>Кадастровый номер 623286305601000100 | 0,1059 | Электричество, газ. Огранич. Водоохранная зона реки Дубровка | 15 754 750 | 2 363 200 | 5 855 200 |
| 7. | д. Кондратовичи, У-2<br>Кадастровый номер 623286303101000080 | 0,15 | Водоснабжение, электричество, газ | 17 605 200 | 2 640 800 | 4 934 650 |

**Аукцион проводится 19 июля 2013 года в 10.00 в здании Совета, документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00 кроме субботы и воскресенья, по 15 июля включительно.** Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 ф-ла № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 153001601, УНН 600181707. Код платежа 04901. Получатель Острошицкий сельисполком. Победитель обязан в течение 10 дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок, код платежа 04901 и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, код платежа 04616.

**Телефоны для справок: 801774 57621, 57635, 57636.**

Председатель А.С. Моисеенко

## Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже недвижимости. Торги проводятся в форме открытого аукциона.

**Торги состоятся 27 июня 2013 г. в 11.00**

**по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.**

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 8 | Емкости для хранения формалина, инв. №№ 6760, 6757, 6758, 6759 | 56 309 760 за ед. | 5 630 976 | 5 | 4 647 705 |
| Лот № 20 | Учебно-лабораторный корпус общ. пл. 2055 кв.м; гараж – 167 кв.м, площадки – 50 кв.м | 2 061 369 000 | 41 227 380 | 5 | 6 958 867 |
| Лот № 25 | Эстакада нижний склад, инв. № 6806, бревнотаска б-22у инв. № 6820, № 6821 площадь земельного участка 0,91 га | 59 195 700 | 5 919 570 | 5 | 3 741 874 |
| Лот № 26 | Здание РММ общ. пл. 845 кв.м, зерносклад дерев. – 145 кв.м, контора л/п – 239 кв.м, трансформаторная будка ТП-28-26 кв.м, водогрейка – 58,6 кв.м, заправочная – 5,10 кв.м, котельная – 98,9 кв.м, проходная – 17,3 кв.м, щитовая – 11,1 кв.м, бензоколонка, инв. № 6822, котел универсальный 6М, инв. № 6823, № 6824; кран-балка 5,2 т, инв. № 6798, электроталь, инв. № 6799, покрытие бетонное – 750 кв.м, дорожное асфальтовое покрытие – 1800 кв.м, асфальтированная площадка – 8000 кв.м, забор деревянный решетчатый – 660 кв.м, забор деревянный сплошной – 1005 кв.м, ворота металлические решетчатые (из арматуры) № 1 – 15,4 кв.м, ворота металлические решетчатые (из арматуры) № 2 – 10,5 кв.м, здание АЗС(литер Б) – 8,5 кв.м, здание АЗС (литер В) 5,1 кв.м, молниеотвод (литер Д1) – высота 15 м, молниеотвод (литер Д2) – высота 15 м, емкость № 1 – объем 26 куб.м, емкость № 2 – объем 4 куб.м, емкость № 3 – объем 5 куб.м, емкость № 4 – объем 11 куб.м, емкость № 5 – объем 13 куб.м, емкость № 6 – объем 13 куб.м, емкость № 7 – объем 50 куб.м, емкость № 8 – объем 4 куб.м, емкость № 9 – объем 4 куб.м, емкость № 10 – объем 4 куб.м, емкость № 11 – объем 4 куб.м, емкость № 12 – объем 3 куб.м, площадь земельного участка 6,4887 га | 1 159 113 924 | 23 182 278 | 5 | 41 846 665 |

**Имущество расположено по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Гоголя, 61, ул. Социалистическая 120, г.п. Лельчицы, ул. Пролетарская, 12. Для участия в торгах необходимо:**

1. Оплатить задаток на р/с 3012002731231 в ф-ле № 317 ОАО «АСБ Беларусбанк» ул. Советская, 130 МФО 151501678, УНН 400088836 г. Мозырь.

2. По 26 июня 2013 г. включительно в рабочие дни с 8.00 до 16.30 подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо предоставляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный и обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ удостоверяющий личность.

В случае, если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начало торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Не явка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона, заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, методическими рекомендациями об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) № 144 от 29.11.2010 г.

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8(0236) 35-60-80, 35-64-99; (029) 685-68-01; (029)834-38-97.**

УНП 300042199

## ОАО «НАФТАН»

**РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ**

(с повышением начальной цены)

**БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:**

- **Киноиспытатель «Ксенотест 450 LF», дата выпуска 1983 г., дата ввода в эксплуатацию 1987 г., начальная цена — 25 200 000 белорусских рублей с НДС.**

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу:
**211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101**
с пометкой «Реализация неликвидов, ксенотест»
**до 11 июля 2013 года.**

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте **www.naftan.by** в разделе «Объявления».

Контактные телефоны: **8 (0214) 55 78 85, 8 (0214) 55 78 66, 8 (0214) 55 79 07, 8 (044) 758 08 33.**

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

Покупатель акций — Мозгов Александр Владимирович, проживающий по адресу: г. Минск, ул. Ландера, д. 8, кв. 12, тел. (029) 650 74 70.

Сообщает о намерении приобрести простые (обыкновенные) акции открытого акционерного общества «Мясомолмонтаж», расположенного по адресу: 220000, г. Минск, ул. Артиллеристов, 8.

Количество приобретаемых акций — 6000 (шесть тысяч) штук.

Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции: 43500 (сорок три тысячи пятьсот) белорусских рублей за одну акцию.

Срок, форма и порядок оплаты акций — оплата производится путем безналичного перечисления денежных средств через расчетно-клиринговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.

Адрес, по которому будет совершаться покупка акций: ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, д. 48а.

Брокер покупателя акций — закрытое акционерное общество «Инвестиционная компания ДжиЭрБи», адрес 220040 г. Минск, ул. Тиражная, дом 63, ком. 10, тел. (017)200 03 50.

Дата начала покупки акций: 20 июня 2013 года.

Дата окончания покупки акций: 31 июля 2013 года.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ, БЛОКИРОВАННЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

### Организатор аукциона — Крошинский сельский исполнительный комитет Барановичского района

| № п/п | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Площадь земельного участка (га) | Назначение участка | Начальная цена объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, Крошинский с/с, аг. Крошин, ул. Тихая, д. 17/5 Кадастровый номер 120483003601000353 | Участок свободен от застройки, водопровод, газопровод, канализация — частные, на расстоянии 100 м, дорога грунтовая | Линия электропередач | 0,15 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 5585700 | 558570 | 6 393 310 кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона |
| 2 | Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, Крошинский с/с, аг. Крошин, ул. Тихая, д. 17/6 Кадастровый номер 120483003601000354 | Участок свободен от застройки, водопровод, газопровод, канализация — частные, на расстоянии 100 м, дорога грунтовая | Линия электропередач | 0,15 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 5585700 | 558570 | 5 331 121 кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона |

**Аукцион состоится 11 июля 2013 года в 14.30 в здании Крошинского сельского Совета и по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Крошинский сельский Совет, агрогородок Крошин.**

Условия аукциона:

1. Наличие не менее двух участников.

2. Приступить к строительству жилого дома не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на земельный участок.

3. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 10%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется до 06 июля 2013 года до 17.00 на расчетный счет 3604211080006 филиал 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 245 (г. Барановичи, бульвар Штоккерау, 8а).

Получатель УНП 200046981 Крошинский сельский Совет депутатов. 225362 Брестская обл., Барановичский р-он, агрогородок Крошин.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан:

- оплатить в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона по оформлению и государственной регистрации создания земельных участков, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведения аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефонам (8 0163)43 72 36, 43 72 35.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка с наибольшей стоимостью.

11. **Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 13 июня по 06 июля 2013 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (каб. 1 сельисполкома).**

**Последний день приема документов — 06 июля 2013 года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона — 11 июля 2013 года с 13.00 до 14.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.**

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на проведение аукциона; произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

*Жыццё ў руху*

# ТАНЦУЮЧЫ, НАВУЧАЦЦА... ЛЯТАЦЬ

## Энергія, экстрым і адрэналін — усё гэта брэйк-данс



**Што ж такое брэйк-данс? Адкуль ён прыйшоў і як развіваўся? Гэта від спорту ці танцавальнае мастацтва? Паспрабуем разабрацца.**

На мяжы 60-70-х гадоў XX стагоддзя ў ЗША з'явіліся людзі, якія дзіўна рухаліся пад музыку. Неўзабаве танец атрымаў назву «Good Foot». Ён спалучаў у сабе падзенне на зямлю з элементамі кручэння пад музыку. Першым, хто стаў сумяшчаць спорт і танцы, стаў дыджэй Кул Герк, які спалучыў амерыканскі джаз, бразільскую барацьбу капаэйру, карэйскае кунг-фу, акрабатыку і твіст. Што і атрымала назву «Break Dance». Пазней брэйк-данс стане часткай хіп-хоп-культуры і пра яго даведаецца ўвесь свет. У нашай краіне мастацтва брэйк-данса вельмі папулярнае сярод моладзі і дзяцей, нягледзячы на тое, што з'яўляецца экстрэмальным. Для кагосьці брэйк-данс становіцца часткай жыцця, а для кагосьці і чымсьці большым.

Напрыклад, для ўдзельніка каманды «Сиаямские белки» Аляксандра Рапінчука:

**— Аляксандр, што для цябе брэйк-данс?**

— Брэйк-данс — гэта не проста акрабатыка, гэта цэлае жыццё ў руху, спосаб самавыяўлення. Калі казаць пра складанасць, то яе няма. Я прыйшоў у брэйк і спытаў сябе: на што я здольны? Чаго магу дасягнуць? І ўжо праз некалькі трэніровак зразумеў, што змагу шмат, галоўнае — жаданне, якое рухае табой, але трэба і старанна трэніравацца. Мастацтва брэйк-данса змянілася, эвалюцыянавала і перайшло на новы ўзровень развіцця. Мне здаецца, што бі-бої (выканаўцы брэйк-данса) хутка навучацца лётаць. Вядома, танцор павінен быць у добрай фізічнай форме, валодаць каардынацыяй і гнуткасцю. Але калі гэтага няма, то ўсё напрацоўваецца падчас трэніровак. Брэйк-данс сучасны і дынамічны від мастацтва, ён адрозніваецца ад усіх жанраў, таму што ні ў адным танцы няма такой колькасці акрабатычных элементаў.

**Мастацтва брэйк-данса змянілася, эвалюцыянавала і перайшло на новы ўзровень развіцця. Мне здаецца, што бі-бої (выканаўцы брэйк-данса) хутка навучацца лётаць.**

**— Дзе ты ўпершыню ўбачыў ці пачуў пра брэйк-данс?**

— Упершыню ўбачыў танцораў, якія цікава рухаліся, у праграмах «Башня» і «До 16 и старше», дзе Da Boogie crew, харэаграфічны калектыў, у аснове творчасці якога ляжаў брэйк-данс, даваў урокі. На той момант не прадаваліся кампакт-дыскі, а інтэрнэт не быў яшчэ развіты, таму даводзілася ўцякаць з урокаў, каб запісаць іх на відэакасету. Увогуле, брэйк-данс стаў неад'емнай часткай майго жыцця.

**— Ты ўдзельнік каманды «Сиамские белки». Як трапіў туды?**

— Гэта адна з першых школ па брэйк-дансе ў Мінску. Заснавальнікам каманды з'яўляецца Міхась Агінец, які і даў мне прытулак у сваёй зале ў 2007 годзе, за што яму велізарны дзякуй. Дарэчы, школа танца нашай каманды знаходзіцца ў ДК МТЗ, прыходзьце, мы заўсёды рады прымаць новыя таленты. У школе можна сустрэць вельмі розных людзей: хтосьці займаецца ў тэатры, хтосьці катаецца на сноўбордзе, ёсць і настаўнікі, і медыкі — з кім толькі не даводзілася мець зносіны; увогуле, шмат цікавых асоб, сярод якіх нямала бі-бояў, дзяцей, якім толькі дванаццаць, і шмат «ветэранаў» брэйк-данса, якім ужо трыццаць. Удзельнікі групы часта ездзяць абменьвацца вопытам у Турцыю, Кітай і Тайвань.

**— З 2003 года ў Мінску праводзіцца «Батл Беларусь» — чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па брэйк-дансе. І твая каманда не раз была яго ўдзельніцай...**

— Мы сталі новым складам каманды «Сиамские белки». Танчылі на фэстах у 2008-м і 2009 годзе. Першы ўдзел быў не самым удалым, што паслужыла для нас добрым урокам: трэба шмат трэніравацца. Да фестывалю «Батл Беларусь — 2009» мы падрыхтаваліся лепш, у нас атрымалася цікавае шоу, нават трохі з гумарам. Гэта быў адзін з самых удалых выступаў. Я лічу, фестываль «Батл Беларусь» дазваляе пераняць вопыт іншых удзельнікаў, усвядоміць свае памылкі, прымушае рухацца наперад, дасягаць новых вяршынь, таму што ў чэмпіянаце прымаюць удзел наймацнейшыя каманды Беларусі, а ў склад журы ўваходзяць аўтарытэтныя танцоры з розных краін і рэгіёнаў.

**— Што ты пажадаеш танцорам-пачаткоўцам?**

— У першую чаргу — цярпення. Не ўсё адразу атрымліваецца. І, вядома ж, трэніравацца і не ленавацца. Толькі так можна дасягнуць жаданага выніку. Поспехаў вам.

Энергія танца і рухаў, экстрым і адрэналін — гэта ўсё пра брэйк-данс. Ды што казаць, лепш самому ўбачыць і адчуць свабоду і ўсплёск эмоцый ад гэтага ўнікальнага танца.

**Маргарыта КУХТА,
студэнтка Інстытута
журналістыкі БДУ.**

*Спортпляцоўка*

# ТАКІ НЕВЯДОМЫ ФЛАРБОЛ



**Усе мы ведаем такія папулярныя віды спорту, як футбол, валейбол, хакей, тэніс. А фларбол? Між тым, сучасны фларбол пачаў зараджацца ў 1958 годзе, калі ў амерыканскім Лейквіле (штат Мінесота) пачалі выпускаць пластыкавыя клюшкі пад брэндам Cosom. На працягу наступных гадоў Cosom-хакей (бэндзі) заваяваў прыкметную папулярнасць у ЗША і Канадзе, але ў асноўным сярод дзяцей і падлеткаў. У гэты ж час клюшкі трапляюць у Швецыю, дзе атрымліваюць велізарную папулярнасць у школах і ва ўніверсітэтах, усё часцей сустракаючыся ў спартыўнай зале, бо аматарам гэтага віду спорту не заўсёды выпадала выходзіць на лёд. Тады гульня была вядомая пад рознымі назвамі: пластыкавы бэндзі, софт-бэндзі, бэндзі ў зале.**



З развіццём фларбола ў 70-я гады стала відавочнай неабходнасць выпрацаваць нейкія адзіныя стандарты і правілы гульні. Так урэшце і з'явіўся фларбол у блізкім да сучаснага выглядзе. Лічыцца, што адбылося гэта менавіта ў Швецыі. У кожнай краіне гульня мела свае назвы (у Швецыі — «innebandy», у Фінляндыі — «salibandy», у ЗША і Канадзе — «floorhockey», а ў Швейцарыі — «unihockey»), якія ўсе ў перакладзе азначаюць — «гульня ў хакей з мячом у закрытых памяшканнях». Са Швецыі гульня трапляе ў Фінляндыю і Швейцарыю, знаходзячы і там вялікую колькасць прыхільнікаў і аматараў пластыкавай клюшкі. А ўжо ў 1981 годзе з'яўляецца першая нацыянальная асацыяцыя — Шведская федэрацыя фларбола. Нечакана другой нацыянальнай асацыяцыяй ў 1983 годзе становіцца Японская асацыяцыя фларбола. З 1996 года сярод мужчын (а з 1997 года — і сярод жанчын) кожныя два гады праводзяцца чэмпіянаты свету. У мужчын трымаюць першынство пачынальнікі фларбола — шведы: яны выйгралі ўсе шэсць чэмпіянатаў. У жанчын шведкі перамагалі тройчы (і ў апошнім турніры 2007 года), два разы выйгравалі фінкі і адзін раз — швейцаркі. У Беларусі ж федэрацыя фларбола з'явілася толькі ў 2009 годзе. Сёння ў нас налічваецца 5 камандаў, і каля 100 чалавек сістэматычна займаюцца фларболам.

Больш падрабязна пра фларбол мы гаворым з **абаронцам мінскага фларбольнага клуба «Энергія» Ягорам ЧЫЧЫНЫМ**.

**— Ягор, чаму ўсё ж такі фларбол?**

— Фларбол — гэта амаль тое ж самае, што і хакей, толькі замест шайбы — пластыкавы мячык, а гульні праходзяць у закрытых памяшканнях на цвёрдай роўнай падлозе. Як і ў хакеі, гульня доўжыцца тры перыяды па 20 хвілін. Кожнай камандзе дазваляецца задзейнічаць па 20 гульцоў. На пляцоўцы, аднак, адначасова можа прысутнічаць не больш за шэсць чалавек з адной каманды. Падчас гульні дапускаецца праводзіць неабмежаваную колькасць замен, якія адбываюцца без спынення гульні. Гэта значыць, усё як у хакеі. Чаму менавіта фларбол? Раней я займаўся хакеем, гуляў у «Залатой шайбе», трэнер прапанаваў паспрабаваць фларбол.

**— Што найперш спадабалася ў гэтай гульні?**

— Галоўнае — гэта адсутнасць цяжкай сумкі з хакейнай формай, бо фларбалісту патрэбна толькі клюшка і пара добрага абутку. Фларбол — гэта, так бы мовіць, больш лёгкі хакей, адсутнасць сілавых прыёмаў, нейкая навізна для мяне, здольнасць паспрабаваць сябе ў чымсьці іншым. І ведаеш, калі я бяру ў рукі клюшку, то адчуваю, што гэта маё.

**— Дзе вы трэніруецеся?**

— Наш клуб складаецца ў асноўным з хлопцаў, якія калісьці займаліся хакеем, такіх, як я. Трэніруемся мы на базе мінскай сярэдняй школы № 9, гуляем у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскага рэзерву па гандболе.

**— А ці праводзяцца ў нашай краіне турніры па фларболе?**

— Мы гуляем у Адкрытай фларбольнай лізе Беларусі як маладзёвая каманда. Таксама мы ездзілі на «Gagarin Cup» у Северадзвінск.

**— І як вашы поспехі?**

— Нам пакуль яшчэ складана змагацца за прызавыя месцы, паколькі мы маладая каманда. Таму гуляем дзеля задавальнення і набываем вопыт.

**— Ці атрымліваеце вы якія-небудзь грошы за гульні?**

— Гм... *(смяецца)*. Не. Мы знаходзімся на самафінансаванні.

**— Фларбол — гэта толькі хобі ці ёсць планы звязаць сваё жыццё з гэтым відам спорту?**

— Хутчэй нейкае захапленне, але, як той казаў, «ніколі не кажы ніколі». Ды і чаму б не сумяшчаць будучую прафесію з гэтым відам спорту? Асабліва, калі ў ім можна перамагаць.

**— І напрыканцы: што трэба чалавеку, які хоча займацца фларболам, і што ты яму можаш пажадаць?**

— Як кажа наш трэнер: «У любой справе галоўнае — жаданне». А ўсім пачаткоўцам я зычу ўдачы, прыгожых перамог, сумленнай гульні і моцнай клюшкі.

**Андрэй ГОЛУБ,
вучань 11 класа
гімназіі №192 г. Мінска.
Фота аўтара.**



SEX—БАЛЯСЫ

# НЮ І ФАНТАН «АРЫГІНАЛЬНАСЦІ»...

**Неяк неўпрыкмет, без прычынна-выніковай сувязі, якую можна было б зразумець, у нашым жыцці з'явілася новая традыцыя: купанне выпускнікоў у фантанах. Раней у свае святы гэтым забаўляліся толькі пагранічнікі і дэсантнікі. Ну, апошніх яшчэ неяк зразумець можна: такім адмысловым чынам яны, напэўна, прыгадваюць свае армейскія навыкі па пераадоленні водных перашкод. А што выпускнікі прыгадваюць і пераадольваюць? Атрымліваецца, як у тым анекдоце. «Ты якую рыбу больш за ўсё любіш лавіць?» — «Кабачкоў!» — «Няма такой рыбы». — «Як гэта — няма? Ікра з кабачкоў ёсць, а рыбы няма?» Я ж нездарма прыгадваў прычынна-выніковую сувязь... Але перш чым вярнуцца да фантанаў, прапаную пачаць увогуле з «апошніх званкоў» і выпускных вечароў і яшчэ адной новай «традыцыі», якая з'явілася на постсавецкай прасторы нядаўна — традыцыі скандалаў.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

...Пачатак ёй (прынамсі, па публічнасці і грамадскім рэзанансе) паклала летась 17-гадовая выпускніца адной са школ Паўлаграда. Дзяўчына прыйшла на развітальны вечар у школу ў празрыстай чорнай сукенцы, нагадвала камбінацыю. Строй дапаўнялі чырвоныя туфлі на высокім абцасе... Карацей кажучы, жанчыны «няцяжкіх паводзін» у сваёй «працоўнай уніформе» часам выглядаюць больш цнатліва, чым глядзелася тая выпускніца на фоне сваіх аднакласнікаў. Развязны выгляд школьніцы не застаўся незаўважаным (яшчэ б!) і выклікаў шырокі рэзананс. Толькі рэдкія галасы спрабавалі калі не абараніць, дык хоць бы апраўдаць у нечым дзяўчыну. Маўляў, сукенка была зроблена па эскізе дызайнера-пачаткоўца, а натхнілі яго на ідэю «зоркі» шоу-бізнесу: яны ж з'яўляюцца на экранах практычна аголеныя. Калі ім можна, нам чаму нельга? Аднак большасць катэгарычна асудзіла школьніцу, зрэшты, як і яе бацькоў. З'явіўся нават анекдот пра тое, як у наступным годзе будзе выглядаць строй выпускніцы. «Дастаткова будзе проста заклеіць каляровай стужкай скотчу прычыннае месца». На шчасце, сёлета такога не здарылася, аднак зноў без скандалу не абышлося. На гэты раз у Татарстане.

Тут 15-гадовая дзяўчына «праславілася» тым, што ўвечары пасля выпускнога фатаграфавалася ў ніжняй бялізне і панчохах, трымаючы ў руках школьную форму. Здымкі гэтай школьніцы з белымі бантамі на галаве імгненна абляцелі інтэрнэт і выклікалі абурэнне грамадскасці. Па патрабаванні апошняй мэр Набярэжных Чаўноў нават загадаў дырэктарам школ апазнаць па фатаграфіях дзяўчыну, а пасля запрасіў выпускніцу на закрытую нараду ў мэрыю, каб абмеркаваць яе амаральныя паводзіны. Гавораць, тая плакала і раскайвалася, баючыся, што цяпер не зможа паступіць у навучальную ўстанову і нават з'ехаць куды, бо яе ўсё роўна пазнаюць... Зноў жа рэдкія галасы паспрабавалі апраўдаць школьніцу: маўляў, такія фотасесіі (і не толькі такія!) зараз ёсць практычна ва ўсіх дзяўчат. Хіба толькі дрэнна, што яны патрапілі ў інтэрнэт і выклікалі такі рэзананс.

...Прыгадваю свой «апошні званок». Школьнікаў выстраілі па форме «карэ». На высачэзны ганак выклікаюць лепшых вучняў, уручаюць ім граматы і дыпломы. У адной дзяўчыны парыў ветру падхапіў падол школьнай сукенкі і выпускніца... блiснула перад усёй школай сваёй ніжняй бялізнай. Усе, вядома, рагатнулі, але ж дзяўчына была невінаватая і яе было шкада (такі казус у савецкія часы!). Цяпер, думаю, парыў ветру мог бы засведчыць наяўнасць адсутнасці на выпускніцы ніжняй бялізны. Ці нават без ветру тое стала б зразумелым у працэсе ўзыходжання на ганак. (Гэта я пра даўжыню сукенак і спадніц многіх цяперашніх выпускніц...)

Дык вяртаючыся да фантанаў. Выгляд хлопцаў у цяльняшках (калі тыя не нападпітку), якія робяць «заплывы», напэўна, мала ў каго выклікае агіду. Усё ж дарослыя людзі, армію прайшлі. А вось выгляд выпускнікоў і найперш выпускніц — маладых дзяўчат, якія ў школьнай форме з выпускнымі стужкамі лезуць у ваду... Гэта яшчэ добра, калі не распранаюцца, бо купальнік пабачыць можна рэдка. А тое і ўвогуле нехта можа кінуцца ў ваду топлес... Добра толькі, што ў нашых гарадах такога амаль што не назіраецца, а калі і бывае часам што, дык выглядае пакуль па большасці прыстойна. Агучаныя вышэй прыклады — з расійскіх і ўкраінскіх «кропак» на карце. Асабіста мне імпануе рэакцыя карыстальнікаў (карыстальніц) сацыяльных сетак, якія пішуць на форумах у адрас цяперашніх дзяўчат: «Дзякуй вам, што мы ў свае 30 гадоў выглядаем лепш, чым вы ў свае 17!». Падаецца, лепш не скажаш... У нас пакуль спакойна, але ж дурная традыцыя, як вы ўжо ведаеце, з'яўляецца... Як тая «рыба-кабачок» — без прычынна-выніковай сувязі.

...Савецкім школьніцам не вельмі падабалася іх форма: карычневыя сукенкі з чорнымі паўсядзённымі і белымі святочнымі фартушкамі. Аднак цяперашнія выпускніцы праўдамі-няпраўдамі шукаюць праз родных і знаёмых — каб апрануць толькі аднойчы, на «апошні званок», — менавіта яе. Вядома, даўжыня сукенак ужо не тая, што раней. Але ж у цэлым — традыцыя! Неблагая, я б сказаў, традыцыя: як повязь пакаленняў...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «ГАЛОЎНАЕ, КАБ НЕ БЫЛО ПОДЛАСЦІ, А З АСТАТНІМ РАЗБЯРУСЯ»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Любоў да музыкі вы атрымалі ў спадчыну ад бацькі?***

— Так, ён музыкант у мінулым. Іграў у свой час у гурце, які быў досыць папулярны. У яго пад'ездзе нават прыхільніцы начавалі. Бацька не любіць пра гэта расказваць, а вось яго брат кожны раз узгадвае пра той час, калі мы з родзічамі збіраемся на нейкім свяце. Прыгадваючы сваё дзяцінства, я без перабольшвання магу сказаць, што мы з сястрой нават прачыналіся і засыналі пад музыку. Бо бацька заходзіў у пакой і ўключаў нейкую мелодыю. Я ведаю ўвесь рэпертуар «Бітлз», «Лэд Зэпэлін», «Ролінг Стоўнз». Музыка суправаджае мяне па жыцці.

***— На якім узроўні сёння знаходзіцца беларускі шоу-бізнес?***

— Ён існуе, але... не хацелася б гаварыць пра ўзровень. Самае смешнае, што нават пры такім становішчы ў ім дастаткова бруду, крывадушнасці і ўсяго, што спадарожнічае гэтай сферы. Таму я імкнуся трымацца ўбаку і не з усімі кантактую. І няхай мяне ў чарговы раз папракнуць, што я дрэнна кажу, але кажу я праўду. Я не абагульняю і не кажу, быццам усе дрэнныя. Ёсць людзі, з якімі я падтрымліваю сувязь, мы запрашаем адзін аднаго на святы і проста часам сустракаемся, але іх не шмат. Мне так больш камфортна, бо маё з'яўленне на сцэне не вельмі радасна сустрэлі. І такая рэакцыя нармальная, гэтак жа, калі б у тэніс прыйшоў чалавек, які не надта добра разбіраецца ў ім. Але я ўжо восем гадоў у гэтай сферы і, думаю, ужо нешта спасцігла, нечага дасягнула, і працягваю працаваць над сабой.

***— Працягваючы тэму, хацелася б спытаць, як суадносяцца сёння талент і фінансы?***

— Мне здаецца, што ў любой сферы, у тым жа тэнісе, не абысціся без грашовага падмурку, калі толькі пачынаеш. Таксама і ў музыцы: таленавітыя людзі рэдка застаюцца незаўважанымі, але рэальнасць патрабуе стартавага капіталу. Бываюць выпадкі, калі талент заўважаюць, аднак усім не дапаможаш з'явіцца на эстрадзе. Таму і даводзіцца выкарыстоўваць іншы арсенал.

***— Мяркуючы па біяграфіі, вам увесь час спадарожнічае ўдача. Ваша паспяховасць абумоўлена збегам абставін?***

— Я заўсёды верыла і працягваю верыць, што калі жадаеш нечага вельмі моцна і гатовы дзеля гэтага сумленна працаваць, то ўвесь сусвет будзе спрыяць табе. Калі казаць пра музыку, то я, як і большасць дзяўчат, у дзяцінстве стаяла каля люстэрка і спявала ў расчоску замест мікрафона. Калі глядзела тэлевізар, то хацелася і там сябе паспрабаваць. Верагодна, сакрэт тут у тым, што я заўсёды адкрыта для нечага новага. Мне гэта часам нават у тэнісе перашкаджала, бо я шмат чым цікавілася, хацела ўсё паспрабаваць. І, мабыць, мне лёс дае шанцы, бо я люблю працаваць. Павінна проста прысутнічаць жаданне жыць, працаваць і вучыцца новаму.



***— Што адчувалі, калі спартыўная кар'ера завяршылася і вы зразумелі — давядзецца займацца нечым іншым?***

— Пра той перыяд я не магу ўзгадваць без слёз, бо ён быў вельмі складаным. Мне здавалася, быццам я нікому не патрэбная, і з-за гэтага я адчувала сябе разгубленай. Потым быў перыяд, калі даведалася, што такое начное жыццё, тусоўкі... Вакол мяне былі ўсялякія людзі. Калі б адзін мой сябар не выцягнуў мяне з гэтай дрыгвы, то нават не ведаю, якім мог быць вынік. Мае бацькі тады былі ворагам нумар адзін, бо яны ж перашкаджалі «адпачываць». Зараз я іх разумею. У нейкі момант маё ўнутранае жаданне стаць на правільны шлях і жыць па-іншаму паспрыяла таму, што мне выпала нагода выправіцца. Спачатку музыка, потым — тэлебачанне, а зараз яшчэ і радыё. І вось, калі ласка, ужо пяты хіт-парад.



***— А ў «хіт-парадзе» вашага сённяшняга жыцця што ў прыярытэце?***

— Незалежна ад абставін (прызнаюся, так было не заўсёды), на першым месцы па-за канкурэнцыяй, безумоўна, сям'я. Мая цяперашняя і будучая, дзе будуць муж і дзеці. Потым ужо ўсе тыя сферы, дзе я працую. Больш за ўсё часу адбірае музыка, а радыё і тэлебачанне па-свойму цікавыя. Тэнісу я б адвяла асобнае месца, бо дзякуючы яму я з'яўляюся той, кім я ёсць сёння. Спартыўны характар дапамагае мне пераадолець любыя цяжкасці практычна штодня.

***— Калі параўнаць спорт з жыццём — якія правілы гульні для вас недапушчальныя?***

— Спадцішка. За спінай. Усялякага кшталту подласць. Хаця і ў спорце гэтага хапала, але ж ты выходзіў і сумленна змагаўся. Перамагаў мацнейшы. Таму галоўнае, каб не было подласці, а з астатнім разбяруся.

**Алена ДРАПКО.**

Кліча лагер-экспедыцыя

# БЯРЫ ВЯСЛО — ГАЙДА Ў ПАХОД!

**Цэнтр экалагічных рашэнняў запрашае ўсіх ахвотных у экалагічны лагер-экспедыцыю «Чысты Нёман—Балтыка 2013», які арганізуецца з 3 па 8 ліпеня.**

Удзел у экалагічнай змене гарантуе яе ўдзельнікам набыццё новых ведаў у галіне ахвоы навакольнага асяроддзя, начоўкі ў палатках, вечары каля вогнішча, купанне ў рэках і азёрах, экскурсіі на гістарычныя аб'екты, а таксама новыя знаёмствы і ўражанні.

У праграме экалагічнай змены запланаваны сплаў на байдарках або велапрабег — выбар за ўдзельнікамі, абследаванне прыбярэжных зон з мэтай пошуку крыніц забруджвання, вызначэнне якасці вады хімічнымі і біялагічнымі метадамі, у ранішні і вячэрні час — дыскусіі, трэнінгі і прагляд фільмаў.

Арганізатары забяспечваюць удзельнікаў харчаваннем, але ўдзельнікі павінны прыхапіць з сабой міску, лыжку і конаўку, а таксама быць гатовымі прыняць актыўны ўдзел у прыгатаванні ежы і выкананні іншай работы «па гаспадарцы». Наяўнасць уласных палатак, спальнікаў і турыстычных дыванкоў вітаецца. Усе выдаткі, звязаныя з праездам і ад'ездам удзельнікаў экспедыцыі, кампенсуюцца. Удзельнікам велапрабегу неабходна мець свой веласіпед і веласіпедны шлем.

Для таго, каб стаць удзельнікам экалагічнай экспедыцыі трэба запоўніць рэгістрацыйную форму http://bit.ly/13Rrylk да 25 чэрвеня. Рэгістрацыйны ўзнос складае 100 тысяч рублёў. Пры неабходнасці арганізатары гатовы разгледзець пытанне аб змяншэнні рэгістрацыйнага ўзносу для асобных удзельнікаў. Колькасць месцаў абмежаваная. Адбор удзельнікаў ажыццяўляецца арганізатарамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.

Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 24.012.
Нумар падпісаны ў 19.30 12.06.2013 г.

■ На слыху

# ГАНДАЛЬ ІНТЭРНЭТ-КРАМ — ПРАЗ КАСУ

**Хутка інтэрнэт-крамы будуць абавязаны выкарыстоўваць пры разліках касавыя апараты.**

З 16 чэрвеня ўступае ў сілу пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка, згодна з якой змяняецца парадак выкарыстання касавага абсталявання і плацежных тэрміналаў. У адрозненне ад ранейшай, выпадкі абавязковага выкарыстання касавага абсталявання, у тым ліку пры гандлю па ўзорах з дастаўкай тавараў на дом ці іншае агаворанае месца, пашыраюцца.

Як адзначаюць у Міністэрстве гандлю, да 16 чэрвеня прыём наяўных грашовых сродкаў пры вядзенні гандлі па ўзорах з дастаўкай тавараў на дом ці іншае агаворанае месца можа весціся без выкарыстання касавага абсталявання. Пры гэтым кожны факт прыёму наяўных грашовых сродкаў павінен быць афармлены квітанцыяй №32. З вышэйназванай даты прыём наяўных грашовых сродкаў можа весціся толькі з выкарыстаннем касавага абсталявання незалежна ад наяўнасці (адсутнасці) касавага абсталявання ў гандлёвых аб'ектах юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца гандлем па ўзорах з дастаўкай тавараў на дом ці іншае агаворанае месца.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 16 (474)

# РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

| Арганічнае рэчыва | вядро 10 л *кг* | слоік 1 л *г* | слоік 0,5 л *г* | шклянка 200 мл *г* | пачак з-пад запалак *г* | сталовая лыжка *г* | чайная лыжка *г* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Попел драўняны | 7 | 600 | 290 | 140 | 10 | 9 | 3 |
| Попел травяны | 5,65 | 550 | 270 | 100 | 8 | 7 | 2,4 |
| Вапна | 14 | 1350 | 650 | 300 | 30 | 25 | 7 |
| Каравяк свежы | 15 | 1200 | 550 | 270 | - | - | - |
| Каравяк сухі | 5 | 400 | 180 | 85 | - | - | - |
| Курыны памёт свежы | 18 | 1750 | 800 | 350 | - | - | - |
| Курыны памёт сухі | 4,5 | 350 | 160 | 70 | 4 | 3 | - |
| Курыны памёт тоўчаны | 8 | 700 | 300 | 140 | 10 | 8 | 2 |
| Пілавінне свежае | 4 | 300 | 140 | 60 | - | - | - |
| Пілавінне прэлае | 6-7 | 600 | 300 | 150 | 12 | - | - |
| Перагной вільготны | 9 | 700 | 340 | 160 | 16 | 14 | 3 |
| Яечная шкарлупіна тоўчаная | 9 | 750 | 370 | 180 | 15 | 12 | 4 |

# ЧАРЭШНЯ З ЧАРЭШАНЬКІ

**Шматлікіх дачнікаў цікавіць пытанне, ці можна вырасціць дрэва з костачкі чарэшні, слівы, вішні, абрыкоса і як гэта зрабіць.**

З костачак чарэшні, слівы, вішні, абрыкоса і г.д. можна вырасціць дрэва, якое ўступіць у пладаношэнне на 5-8-ы год ці пазней. Узнікае пытанне: якое мы вырасцім дрэва? Гэта будзе дрэва з уласнымі каранямі насеннага паходжання (сеянец), зусім новая форма, якая будзе адрознівацца ад матчынай расліны, у чым будзе магчымасць пераканацца, калі з'явяцца першыя плады. У костачкі, якія пасеем, будуць закладзены новыя спадчынныя асновы як матчынага дрэва, з якога зняты плады, так і бацькавага, невядомага, прынесенага насякомымі. Вы атрымаеце форму (сеянец) ад вольнага апылення.

Калі хочаце атрымаць ідэнтычны гатунак, плады якога вельмі спадабаліся, варта паступіць наступным чынам. З костачкі (ад зімаўстойлівага дрэва) вырасціць дзічку (сеянец), затым зрэзаць чаранок з упадабанага дрэва і прышчапіць іх на дзічку — атрымаеце высадак. Высадак можна вырасціць як на асобным участку, так і адразу на сталым месцы. Прышчэпленая расліна костачкавых культур здольная даць першыя плады на 2-4-ы год пасля пасадкі на сталае месца.

# ДАЙКОН

**Не так даўно на прылаўках з'явіўся дайкон, і з кожным годам гэтая гародніна становіцца ўсё больш папулярнай.**



Ён нагадвае рэдзьку, але, у адрозненне ад яе, не змяшчае гарчычных алеяў. Навукоўцы кажуць, што гэта разнавіднасць радыскі. Але выведзены ён у старажытныя часы з рэдзькі, якая расце ў Кітаі. Па іншай версіі, яго вывелі японцы, але, ізноў жа, з кітайскай расліны лоба. У Японii дайкон упершыню згадваецца ў XVIII стагоддзі.

Дайкон — Raphanus sativus — агароднінная адна- ці двухгадовая расліна з сямейства капусных. Вырошчваецца як аднагадовая расліна. У нас яго можна вырасціць і ў адкрытым, і ў абароненым грунце.

Караняплоды дайкон утварае разетку лісця да 50-60 см вышынёй. У некаторых раслін лісце вырастае да 18-20 см, у іншых — да 30-35 см. Лісце даўгаватае, з буйнымі зубцамі па краі. Караняплоды круглявыя ці трохі пляскатыя або цыліндрычныя, сакавітыя, белыя. Дыяметр пладоў і вага — самыя розныя. Сустракаюцца нават расліны вагой да 4 кг. Высокая ўраджайнасць вызначаеца наяўнасцю ў дайконе гена гігантызму. Акрамя мякаці караняплодаў, у ежу ўжываюць маладую зеляніну.

Караняплоды дайкона ўтрымліваюць вітаміны групы В, РР, С, карацін, клятчатку, пекцін, ферменты, калій, кальцый, жалеза, фосфар, серу, медзь. У лісці дайкона вітаміну С у 6 разоў больш, чым у караняплодах.

Дайкон любіць сонца, але не любіць доўгі дзень — адразу ж выпускае кветкавую стрэлку. Гэта непераборлівая расліна, але лепшыя ўраджаі дае на ўрадлівых глебах з глыбокім ворным пластом. Тэрмін пасеву ў нашых умовах — 10—15 ліпеня. Пры больш ранніх тэрмінах магчыма стрэлкаванне раслін. Хуткаспелыя гатункі можна збіраць праз 50—60 дзён пасля пасеву, сярэднеспелыя — праз 65—75, познаспелыя — праз 90—120 дзён.

Агратэхніка дайкона шмат у чым падобная на агратэхніку рэдзькі. Пад перакопку не ўносяць гной, таму што ўтвараюцца выродлівыя караняплоды. Звычайна выкарыстоўваюць мінеральныя ўгнаенні: 15 г мачавіны, 40 г суперфасфату, 20 г калійных угнаенняў на 1 м$^2$. Лепш дайкон вырошчваць на градках, дзе адлегласць паміж радамі 50—60 см, а ў радзе — 25—40 см па 2-3 семачкі ў гняздо. Усходы з'яўляюцца на 3-4 дзень. У фазе 2-3 сапраўдных лістоў расліны прарэджваюць, пакідаючы найбольш моцныя экзэмпляры. Палiваюць па меры неабходнасці. Міжраддзі рыхляць. Для абароны ад крыжакветнай блошкі апыльваюць расліны попелам і ў гарачае надвор'е часцей паліваюць.

Не варта перапрымліваць караняплоды ў полі, бо тады яны перарастаюць, хутка грубеюць таварныя якасці і могуць выкінуць кветканос. Расліны вырываюць за бацвінне ці частку караняплода, якая выступае з глебы, чысцяць ад зямлі, абразаюць лісце.

Захоўваюць дайкон у склепе ці халадзільніку. Для папярэджання падвяласці караняплоды перасыпаюць пяском ці змяшчаюць у поліэтыленавыя пакеты, але не завязваюць іх.

Дайкон з'яўляецца дыетычным прадуктам: у 100 г — усяго 20 кілакалорый.

Як лекавую расліну яго выкарыстоўвалі са старажытнасці. Сучасная медыцына выявіла ў саставе дайкона эфір ізарадонавай кіслаты, які з'яўляецца прафілактыкай анкалогіі. Акрамя таго, дайкон паляпшае страваванне, змагаецца з кішэчнымі расстройствамі, атэрасклерозам, гіпертаніяй, атлусценнем, выводзіць з арганізма лішнюю вадкасць, халестэрын, солі цяжкіх металаў, таксіны і шлакі. У ежу ўжываюць свежы дайкон, надзёрты на тарцы.

Дзякуючы вялікай колькасці фітанцыдаў, дайкон валодае антыінфекцыйнымі, бактэрыцыднымі і супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі, з'яўляецца сродкам прафілактыкі грыпу, прастуды. Выкарыстоўваюць яго для аднаўлення пасля вірусных захворванняў, харчовых атручэнняў. Ён падаўляе шкодную мікрафлору кішэчніка, чысціць ныркі і печань, раствярае камяні.

Сучасная народная медыцына выкарыстоўвае дайкон для лячэння ацёкаў, хвароб нырак, мачавага пузыра, печані, дыябету. Пры дыябеце рэкамендуецца піць свежапрыгатаваны сок дайкона па 0,25 шклянкі 3 разы ў дзень да яды. Калі ўжываць дайкон у ежу, то ён дапамажа пазбавіцца ад хранічнай стомленасці, дэпрэсіі, наступстваў стрэсаў. Натуральныя антыаксіданты, якія змяшчаюцца ў караняплодах, не даюць арганізму старэць і валодаюць рэгенерыруючым дзеяннем. Для прафілактыкі прастудных захворванняў і пры хваробах дыхальных шляхоў, хваробах лёгкіх прымаюць сок дайкона з мёдам у прапорцыі 1:1. Кашыцу з дзёртага дайкона прыкладваюць да ран, язваў.

Пры рэўматызме і падагры змешваюць сок дайкона, мёд і 70%-ы спірт у прапорцыі 3:2:1, настойваюць 5 дзён, захоўваюць у халадзільніку, уціраюць у вобласць суставаў.

Дайкон нельга спажываць пры язве страўніка і дванаццаціперснай кішкі, падагры, асцярожна і патроху — пры гастрыце, захворваннях печані і нырак.

Дайкон асабліва шырока выкарыстоўваецца ва ўсходніх і ўсходнееўрапейскіх кухнях. На Усходзе выкарыстоўваюць і свежыя парасткі дайкона — як гарнір. У Японіі дзёрты дайкон часта выкарыстоўваецца як гарнір для смажанай рыбы, марынуецца, дадаецца ў супы, падаецца з тушаным мясам, у тушаным выглядзе з кальмарам ці васьміногам. Ва ўсходнееўрапейскіх кухнях дайкон дадаецца ў салаты на алеі ці са смятанай.

■ Экслібрыс «Звязды»

# КРЭСІВА ЧУЖЫХ ЖЫЦЦЯЎ

***Рублевская Л.И. Рифма ценою в жизнь : эссе по истории белорусской литературы / Людмила Рублевская. — Минск: Издательский дом «Звязда», 2013. — 280 с. (Беларусь: вчера и сегодня).***




